Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛЮТАГА 2015 г. АЎТОРАК № 30 (27888) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«Кавалі» Вялікай Перамогі

СТАР. 5

Адслужы, як трэба, і жаніся

СТАР. 10

Чароўная сіла таленту

СТАР. 13

ЛІЧБА ДНЯ

Каля 500

спартсменаў з больш чым 40 краін свету разыграюць 16 камплектаў медалёў падчас чэмпіянату свету сярод юнакоў і юніёраў у Раўбічах. Беларусь прадставяць 20 спартсменаў з Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей, а таксама з Мінска. Урачыстая цырымонія адкрыцця чэмпіянату адбудзецца сёння ў сталіцы ў 20.00 на плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.02.2015 г.

Долар ЗША	14860,00 ▼
Еўра	16960,00 ▼
Рас. руб.	237,50 ▲
Укр. грыўня	569,35 ▲

ISSN 1990 - 763X

■ Наша вышыня

Навукоўцы «сталі» на крыло

Супрацоўнікі Фізіка-тэхнічнага інстытута НАН Беларусі пачалі серыйны выпуск беспілотнай авіяцыі з радыусам дзеяння каля 300 кіламетраў

«Буслы» збіраюць выключна ўручную.

Свет хутка змяняецца. Узнікаюць новыя тэндэнцыі, калі беспілотныя авіяцыйныя комплексы пачалі рэальна выцясняць традыцыйную авіяцыю пры рашэнні задач маніторынгу мясцовасці і аб'ектаў. Такія сучасныя тэхналогіі дазваляюць атрымліваць спажыўцам аператыўную інфармацыю ў рэжыме рэальнага часу. Больш за тое, беспілотная авіяцыя значна таннейшая ў эксплуатацыі і абслугоўванні, не патрабуе інфраструктуры аэрадромаў і не мае абмежаванняў на выкарыстанне ў экстрэмальных умовах. Наша краіна таксама вырашыла не спаць у шапку і прыняла ў лютым 2011 года дзяржаўную праграму па стварэнні шматфункцыянальных беспілотных авіяцыйных комплексаў (БАК). Днямі карэспандэнт «Звязды» наведаў спецыяльную пляцоўку сталічнага Фізіка-тэхнічнага інстытута, дзе за чатыры гады была наладжана сур'ёзная вытворчасць айчынных беспілотных «крылаў».

«БУСЕЛ» СОЧЫЦЬ ЗА ЛЕСАМ

Першымі ў інстытуце былі створаны комплексы класа «міні», якія былі разлічаны на відэаманіторынг мясцовасці ў адлегласці ад аператара да 25-50 кіламетраў. Такое паслухмянае штучнае птушаня распрацоўшчыкі ахрысцілі «Буслом». Апошняя мадыфікацыя БАКа мае назву «Бусел М-50», і працуе ён у паветры да 2,5 гадзіны, з радыусам дзеяння 50 кіламетраў. Дыяпазон хуткасцяў складае ад 60 да 120 кіламетраў у гадзіну.

— Такі амаль цацачны беспілотнік у неба запускаецца з рукі з любога пункта нашай тэрыторыі, — расказвае **начальнік навукова-вытворчага цэнтра (НВЦ) «БАК і тэхналогіі» Юрый ЯЦЫНА.** — Аднак гэта сапраўды сур'ёзны апарат, які мае вагу ўзлёту каля 10-15 кілаграм і карысную нагрузку да 1,5 кг. Гэта не толькі якасная відэакамера, але і інфрачырвоная або мульціспектральная фотакамера. Такі «бусел» абавязкова заўважыць і зафіксуе нават нязначныя ўзгаранні ў лясах, несанкцыянаваныя звалкі, можа ажыццяўляць суправаджэнне і ахову транспартных патокаў.

Цяпер пры вытворчасці БАКаў класа міні работнікі інстытута выкарыстоўваюць прыкладна 80% беларускіх камплектуючых (а на старце было каля 20%). Сёння за мяжой набываюць толькі відэакамеры, рухавікі, батарэі і камп'ютары. Сёлета ў першай палове года плануецца распрацаваць уласныя электрычныя рухавікі, а да канца года — запусціць іх серыйную вытворчасць.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

А пакуль на беларускіх беспілотніках стаяць кітайскія рухавікі. Раней выкарыстоўвалі нямецкія і італьянскія ўзоры, але там не хапала магутнасці для ўзлёту з рукі. Кітайскія ў нашым выпадку падыходзяць, але застаюцца пытанні наконт надзейнасці. Таму навукоўцы і разлічваюць стварыць свой электраматор.

СТАР. 6

■ Надвор'е

МАРАЗЫ АДСТУПАЮЦЬ

А на выхадных прыгрэе да плюс 7 градусаў

Аднак у аўторак тэрыторыя нашай краіны яшчэ застанецца пад уплывам халоднага антыцыклону, сфарміраванага ў арктычнай паветранай масе. Таму захаваецца марознае і сонечнае надвор'е, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Будзе без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да мінус 6 градусаў. А вось з серады надвор'е пачне істотна мяняцца, калі да нас завітае вільготнае паветра з захаду Еўропы. Таму пераважна ў паўночных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж. Чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Узмацніцца паўднёва-заходні вецер. Тэмпература паветра ўначы на сераду яшчэ да 5-12 марозу, а па паўднёвым усходзе — нават да мінус 15 градусаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў. У чацвер атмасферныя франты з боку Балтыйскага мора прынясуць у нашу краіну кароткачасовыя ападкі (дождж і мокры снег). Месцамі чакаецца туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе ад мінус 6 да плюс 1 градуса, пры праясненнях па паўднёвым усходзе — да 7-10 марозу. Удзень тэмпературны фон складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, напрыканцы тыдня пацяпленне працягнецца. І ў пятніцу чакаецца вільготнае надвор'е, калі амаль паўсюдна будзе ісці дождж. Месцамі туман, а ўначы і раніцай галалёд. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 2, удзень — 1-7 цяпла. Будзе цёпла і ў выхадныя. Чакаецца месцамі дождж. Тэмпература ўначы будзе каля нуля, а ўдзень ад 0 да 7 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ПАДАТКІ ЯК СТЫМУЛ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

Пастаянныя змяненні падатковых ставак недапушчальныя

Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр ЛУКАШЭНКА заявіў на нарадзе аб актуальных пытаннях падатковай палітыкі, паведамляе БЕЛТА.

«Шчыра кажучы, можа, варта адзін раз максімальна адкарэкціраваць, каб потым некалькі гадоў усім спакойна працаваць?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У час нарады кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на шэраг аспектаў, у прыватнасці, на стан падатковай сістэмы Беларусі. «Апошнім часам зроблена нямала па ўдасканаленні гэтай сістэмы. Скарочана і колькасць падаткаў, спрошчана адміністраванне, уведзена электроннае ўзаемадзеянне з плацельшчыкамі падаткаў, — адзначыў Прэзідэнт. — Быццам бы стала лепш, што пацвярджаецца міжнародным рэйтынгам».

«З іншага боку, часта нешта змяняць у падатках — можна ўпасці ў крайнасць і нанесці ўрон стабільнасці краіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнту дакладваюць, што ўжо і прадпрымальнікі просяць, каб спынілі ўсялякія рэформы ў падатковай сферы, патрэбна стабільнасць.

Яшчэ адзін аспект, на якім спыніўся на нарадзе беларускі лідар,— падатковае адміністраванне. «Падаткаабкладанне павінна быць максімальна простым, зразумелым кожнаму і лагічным. Гэта пытанне, калі хочаце, не толькі эканамічнае, але і псіхалагічнае. Часам падатковае заканадаўства маленькую фірму прымушае трымаць бухгалтараў больш, чым колькасць самой фірмы. Гэта ненармальна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што цяпер у Беларусі няма магчымасці прапаноўваць падатковыя льготы ў ранейшым аб'ёме. «Калі раней на пэўным этапе ў нас была магчымасць прадастаўляць такія падатковыя льготы, цяпер іншы час. Ад індывідуальных ільгот наогул, напэўна, трэба адыходзіць», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Мы павінны зыходзіць з прынцыпу, калі ўсе суб'екты гаспадарання працуюць у аднолькавых умовах. Выключэнне могуць складаць толькі прыярытэтныя віды дзейнасці, якая ўяўляюць цікавасць для дзяржавы з пункту гледжання стварэння ўмоў для эфектыўнага развіцця і, вядома ж, атрымання аддачы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Цяпер у краіне дзейнічае амаль 250 падатковых ільгот. Бюджэт толькі ў 2013 годзе недабраў з-за гэтага каля мільярда долараў ЗША. Прэзідэнт адзначыў, што падатковыя льготы патрэбны, каб стымуляваць прыярытэтныя віды дзейнасці і дабіцца важкай аддачы. «Аднак трэба прызнаць, што мы надавалі столькі льгот, што цяпер самі з цяжкасцю можам разабрацца», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Падчас нарады таксама закраналася пытанне ажыццяўлення падатковага кантролю. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што падатковая інспекцыя — гэта не кансультант, які ўвесь час нешта растлумачвае і падказвае бухгалтару, але гэтага не пазбегнуць. «Нікуды не дзенешся, у жыцці заўсёды так бывае, што, правяраючы, кантралюючы, падатковаму інспектару даводзіцца кансультаваць прадпрымальнікаў, раіць бухгалтарам. Але гэта не галоўная функцыя падатковага інспектара», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Работнік падатковых органаў — гэта кантралёр! У многіх краінах, і гэтага ніхто не ўтойвае, падатковая — галоўны фіскальны орган дзяржавы, і для нас важная задача — павысіць статус і прэстыж падатковай службы», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Нельга забываць, што без падаткаў няма дзяржавы. Аднак падаткі — гэта не толькі фіскальны інструмент, але і стымул для развіцця эканомікі. Таму перабору быць не павінна», — падагульніў Аляксандр Лукашэнка.

ЗА ЎМАЦАВАННЕ СУВЯЗЯЎ

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў медалём Францыска Скарыны загадчыка сектара выдавецтваў аддзела выдавецтваў, арганізацыі рэкламы і інфармацыі Міністэрства культуры і турызму Азербайджана Чынгіза Аліева, начальніка дзяржаўнай некамерцыйнай арганізацыі «Цэнтр кнігі і выдавецкай справы» Міністэрства культуры Арменіі Эдуарда Мілітаняна, члена Саюза мастакоў Малдовы, намесніка старшыні рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Беларускае таварыства ў Рэспубліцы Малдова» Вячаслава Ігнаценку. Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 лютага, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы. Гэтай узнагароды яны ўдастоены за значны ўклад у развіццё культурна-гуманітарных сувязяў, прапаганду беларускай культуры і літаратуры, умацаванне міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы інфармацыі і друку.

На міжнародны ўзровень

Наша краіна гатовая прымаць саміты самага высокага ўзроўню. Аб гэтым заявіў памочнік Прэзідэнта Беларусі, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр Радзькоў перад пачаткам семінара з удзелам актыву пярвічных арганізацый.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

«Мы хочам і можам узаемадзейнічаць. Сёння сітуацыя складваецца такім чынам, што ўвайсці ў вайну лёгка, выйсці ж з яе — вельмі складана. Беларускі народ на генетычным узроўні разумее, што такое вайна. І таму з самага пачатку мы па меры сваіх сіл стараліся дапамагчы вырашыць сітуацыю, якая склалася ў нашых суседзяў. Літаральна ўся наша краіна была ўцягнута ў міратворчы працэс. І ў гэтым плане мы гатовы супрацоўнічаць з усімі дзяржавамі. Галоўнае, каб у свеце ведалі: Беларусь — гэта суверэнная дзяржава, яна праводзіць сваю палітыку. Гэта трэба зразумець і прыняць».

Аляксандр Радзькоў распавёў і пра семінар, правядзенне якога стала традыцыяй. «Абменьваемся вопытам паміж рэгіёнамі, прадумваем акцыі, плануем сваю працу, каб зрабіць яе больш выніковай», — заўважыў ён.

«Напярэдзе ў нашай арганізацыі падпісанне некалькіх дагавораў аб супрацоўніцтве, у тым ліку са значнымі палітычнымі сіламі краін СНД і далёкага замежжа», — сказаў старшыня арганізацыі.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

БЕЗ РЭЗКІХ ПАВАРОТАЎ

Пасля саміту «нармандскай чацвёркі» ў Мінску наша краіна і яе сталіца былі ў цэнтры навін ва ўсім свеце. Самая пільная ўвага журналістаў была прыцягнута і да беларускага лідара. У прыватнасці, вядучыя расійскія тэлеканалы «фішкай» сваіх вячэрніх эфіраў у аналітычных праграмах мінулых выхадных пазначалі менавіта інтэрв'ю з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Размова ішла пра вынікі падзеі планетарнага маштабу ў Мінску і палітычнай пазіцыі Беларусі.

У прыватнасці, у эксклюзіўным бліц-інтэрв'ю вядучаму праграмы «Весткі ў суботу» на тэлеканале «Расія 1» Сяргею Брылёву кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў: «Я не казаў бы, што мы неяк наладзілі адносіны з імі (заходнімі лідарамі. — Заўвага БЕЛТА). Не пешчу тут ніякіх надзей. Абсалютна шчыра і сумленна хачу сказаць: я ўжо не ў тым узросце, калі людзі шарахаюцца, робяць крутыя, рэзкія павароты і гэтак далей. Па-першае, прабачце за нясціпласць, я маю нейкі палітычны вопыт, не толькі багажом, ён таксама за плячыма ёсць. Я ўжо гэтага наглядзеўся, бачыў розныя перамовы, вёў іх».

«Мне ўсё гэта вядома і, каб, ведаеце, галава закружылася... Ад чаго, уласна, галава ў мяне закружылася? Ад таго, што мяне папрасілі, мне даручылі ўрэшце арганізаваць гэтае мерапрыемства? — заўважыў Прэзідэнт Беларусі. — Бог з вамі, я не перабольшваю тут ролю Беларусі і сваю ролю, як звычайна. Не перабольшваю».

«Таму, калі вы думаеце, што гэта прычына мне некуды павярнуцца — выкіньце гэта з галавы. Гэтага, па-першае, ніколі не будзе. Па-другое, шчыра кажу, мяне і не запрашаюць, і там не чакаюць. А па-трэцяе, мы ж з вамі рускія людзі. Пра што размова, мы з вамі людзі, якія нарадзіліся на адной зямлі, у нас ёсць агульная гісторыя. У нас агульныя погляды. І, напэўна, немалаважна, як бы вы там не думалі пра нашы адносіны, з Прэзідэнтам Расіі мы сябры, не толькі браты родныя, але і сябры. Вось з гэтага і зыходзьце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Хачу, каб вы разумелі: мы гэта не афішавалі, але свае прапановы і сваю пазіцыю да перамоў (аб урэгуляванні ўкраінскага крызісу) выказалі, і ўсе ўдзельнікі яе ведалі. Упэўнены, што наша пазіцыя па Украіне ў бліжэйшай будучыні будзе запатрабавана. Можа, і гэта неяк паўплывала на тое, што вось у такім фармаце перамовы адбыліся ў Мінску», — адзначыў у інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены ў тым, што вайну ва Украіне трэба спыніць.

Аляксандр Лукашэнка даў таксама эксклюзіўнае інтэрв'ю Вадзіму Такмянёву, вядучаму інфармацыйна-аналітычнай праграмы «Цэнтральнае тэлебачанне» расійскага тэлеканала «НТБ», паведамляе БЕЛТА. Падчас размовы Прэзідэнт падзяліўся сваімі ўражаннямі па выніках перамоў у «нармандскім фармаце». Кіраўнік дзяржавы, у прыватнасці, расказаў пра некаторыя пратакольна-арганізацыйныя асаблівасці правядзення сустрэчы «нармандскай чацвёркі».

Адзіная сістэма навуковых экспертыз

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Дэкрэт № 1, якім уносяцца дапаўненні і змяненні ў Дэкрэт ад 5 сакавіка 2002 г. № 7 «Аб удасканаленні дзяржаўнага кіравання ў сферы навукі», і Указ № 57, якім унесены дапаўненні ва Указ ад 7 жніўня 2012 г. № 357 «Аб парадку фарміравання і выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакументы накіраваны на стварэнне адзінай сістэмы дзяржаўнай навуковай і дзяржаўнай навукова-тэхнічнай экспертыз.

Дэкрэтам прадугледжана ўскладанне на ДКНТ функцый, якія тычацца забеспячэння функцыянавання сістэмы, арганізацыі і правядзення дзяржаўнай навуковай і дзяржаўнай навукова-тэхнічнай экспертыз, вядзення дзяржаўнага рэестра правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, маніторынгу іх камерцыялізацыі.

У сістэму экспертыз уключана ведамасная навукова-тэхнічная экспертыза праектаў, што выконваюцца за кошт сродкаў рэспубліканскіх і мясцовых інавацыйных фондаў. У сувязі з гэтым указ дапаўняе Палажэнне аб парадку фарміравання і выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў нормай аб правядзенні ведамаснай навукова-тэхнічнай экспертызы і пры неабходнасці — дзяржаўнай навукова-тэхнічнай экспертызы.

Дзяржаўная навуковая і дзяржаўная навукова-тэхнічная экспертызы праводзяцца па адзіных правілах, ведамасная навукова-тэхнічная экспертыза — з улікам агульных прынцыпаў і крытэрыяў ацэнкі.

Стварэнне адзінай сістэмы дасць магчымасць павысіць эфектыўнасць і якасць экспертыз, а таксама адказнасць дзяржаўных заказчыкаў і экспертаў за прыняцце рашэнняў аб мэтазгоднасці фінансавання праектаў за кошт бюджэтных сродкаў.

■ Алё. Хто гаворыць?

РОЎМІНГ ПАТАННЕЕ

Прынцыпы справядлівага роўмінгу будуць распрацаваны для аператараў сувязі Еўразійскага эканамічнага саюза, паведаміў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА намеснік дырэктара Дэпартамента антыманапольнага рэгулявання Еўразійскай эканамічнай камісіі Аляксандр КУРЫЛЬЧЫК.

Праект, які распрацоўваўся з улікам міжнароднага вопыту, прадугледжвае вызначэнне эканамічна абгрунтаваных тарыфаў і празрыстасць іх фарміравання, прадастаўленне роўных магчымасцяў для ўсіх абанентаў і забеспячэнне недыскрымінацыйнага доступу да сетак аператараў сувязі, а таксама развіццё альтэрнатыўных паслуг мабільнай сувязі ў роўмінгу. «Такім чынам, шляхам добраахвотных дзеянняў аператараў сувязі плануецца паэтапнае зніжэнне платы за роўмінг і выраўноўванне яе на тэрыторыі ЕАЭС, — падкрэсліў Аляксандр Курыльчык. — Пры зніжэнні тарыфаў у роўмінгу аператары змогуць зарабляць на росце аб'ёмаў трафіку, дзякуючы чаму будзе дасягнуты баланс інтарэсаў абанентаў і аператараў».

У дачыненні да аператараў сувязі краін ЕАЭС, якія парушаюць правілы канкурэнцыі, антыманапольныя органы будуць праводзіць расследаванні і прымяняць штрафныя санкцыі. Па звестках ЕЭК, сёння розніца базавых тарыфаў на міжнародныя званкі і выходныя званкі ў роўмінгу з сетак сотавых аператараў у Беларусі, Расіі і Казахстане складае ад 4,4 да 5,9 раза. У цэлым тарыфы на званкі ў краінах «тройкі» ў сярэднім у 3-5 разоў перавышаюць максімальны тарыф у дзяржавах ЕС, на SMS у роўмінгу — у 2-3 разы, на перадачу звестак — у 8-21 раз. У адпаведнасці з Дагаворам аб ЕАЭС, да 1 студзеня 2020 года павінен быць зацверджаны адзіны падыход да цэнаўтварэння на паслугі па пропуску трафіку ў дзяржавах — членах саюза.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное предприятие

«УКС Фрунзенского района г. Минска»

Застройщик – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 256-64-18, 399-53-91.

Режим работы – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45 – 16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Проектом предусмотрено строительство объекта «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32А» (1, 2 пусковые комплексы).

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 10 (десять) трехкомнатных квартир (196, 225, 240, 256, 260, 364, 368, 376, 380, 388).

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации при строительстве квартир площадью от 92,3 кв.м составляет 18 900 000 белорусских рублей.

Предполагаемый срок ввода – июль 2015 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 102, тел.: 256-64-18, 399-53-91.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) для заключения договора;

- оплата 40% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 банковских дней с даты получения договора.

Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв.м. общей площади квартир и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.

УНП 190580553

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка ўпраўлення друкаваных сродкаў масавай інфармацыі і знешніх сувязяў міністэрства Гусаковай Галіне Вітальеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні намесніку начальніка ўпраўлення друкаваных сродкаў масавай інфармацыі і знешніх сувязяў Міністэрства інфармацыі Гусаковай Галіне Вітальеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

■ Будзь у курсе!

НАДБАЎКІ ДА КАТЭГОРЫЙ ВЫРАСЛІ ВА ЎСІХ ПЕДАГОГАЎ

Савет Міністраў ліквідаваў розніцу ў падыходах да налічэння надбавак да заробкаў педагогаў, якія працуюць у сістэме аховы здароўя і сацыяльнай абароны, з іх калегамі ў сферы адукацыі.

Нагадаем, што з 1 верасня 2014 года памер надбавак да кваліфікацыйных катэгорый педагагічных работнікаў устаноў адукацыі быў перагледжаны ў бок павышэння. Аднак гэта норма не распаўсюдзілася на педагагічных работнікаў, занятых у арганізацыях іншых ведамстваў — аховы здароўя і сацыяльнай абароны.

Як патлумачылі ў Міністэрстве адукацыі, пастанова ўрада прынята ў мэтах аднастайнага падыходу ў аплаце працы педагагічных работнікаў і павышэння іх заработнай платы. Дакумент распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі з 1 студзеня бягучага года.

Заробкі вырастуць у работнікаў дамоў дзіцяці, дзіцячых бальніц (дзіцячых аддзяленняў), рэабілітацыйных цэнтраў, санаторыяў, дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў. З 1 студзеня ім належаць такія ж надбаўкі за кваліфікацыйныя катэгорыі, як і педагагічным работнікам устаноў адукацыі. Надбаўка за 2-ю кваліфікацыйную катэгорыю павялічылася з 15 да 30%, за 1-ю катэгорыю — з 20 да 55%, за вышэйшую катэгорыю — з 30 да 90%, за катэгорыю настаўнік-метадыст — з 40 да 120%.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Блізкая ўлада

Пытанні па ЖКГ па-ранейшаму ў лідарах

«Прамыя лініі» з удзелам першых асоб выканаўчай улады папулярнасці сярод насельніцтва не страчваюць. На чарговы «прыём» па тэлефоне, які праводзіў 14 лютага намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Віктар Некрашэвіч, звярнуліся 30 жыхароў рэгіёна.

Траціна пытанняў датычылася менавіта камунальна-бытавых паслуг. Праблема жыхароў вуліцы Прытыцкага з Малой Бароўкі, якая знаходзіцца ў гарадской мяжы Магілёва, даўно ўжо перайшла ў разрад «барадатых». Яшчэ 15 гадоў таму вуліца была газіфікавана, і толькі 4 дамы засталіся без цэнтралізаванага ацяплення. Праблема ў тым, што яны знаходзяцца ў балоцістай мясцовасці. Людзям паабяцалі, што, магчыма, прыйдзецца весці газавую трубу паветраным шляхам, але далей размоў справа не пайшла. Сем'ям па-ранейшаму даводзіцца карыстацца дровамі. На іх звароты адзін адказ: грошай няма.

Некалькіх грамадзян турбавалі праблемы, звязаныя з запазычанасцю па заработнай плаце. Віктар Некрашэвіч паабяцаў, што яны будуць вырашаны на гэтым тыдні. Пенсіянерка з Глуска паскардзілася, што на працягу двух дзён не магла атрымаць пенсію. Ёй тлумачылі гэта нейкімі тэхнічнымі непаладкамі з сувяззю. Званок на «прамую лінію» дапамог вырашыць пытанне ў той жа дзень. Па астатніх дадзены даручэнні, іх выкананне пастаўлена на кантроль. Свае праблемы змаглі агучыць жыхары Магілёва, Бабруйска, а таксама Горацкага, Глускага, Клічаўскага, Клімавіцкага, Слаўгарадскага і Чэрыкаўскага раёнаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Агульны інтарэс

НЕ ПАЛОХАЦЬ, А ДАВАЦЬ АЛЬТЭРНАТЫВУ

Сталічныя ўлады шукаюць новыя падыходы да барацьбы з наркотыкамі

Плакаты «Не» наркотыкам», якія дзе-нідзе можна ўбачыць на гарадскіх вуліцах, ужо добра-такі набілі аскому. Агітацыя і афіцыйныя паведамленні, сацыяльная рэклама, этыкеткі на пачках цыгарэт — у змаганні з наркатычнай навалай, якая захапіла беларускую моладзь, гэта ўсё неэфектыўна. Што рабіць, каб грамадства (і ў першую чаргу маладыя людзі) усвядоміла, што наркотыкі — зло, якое вынішчае генафонд нацыі, вырашалі на выязным пасяджэнні Мінгарвыканкама.

Праходзіла пасяджэнне ў актавай зале Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, і месца гэта было выбрана недарэмна: больш за 80% пацыентаў яе таксікалагічнага аддзялення — курыльшчыкі спайсаў.

Ужо шмат гадоў у сталіцы, ды і па ўсёй краіне, на розных узроўнях робяцца шматлікія захады, каб спыніць распаўсюджванне наркотыкаў. У кожным раёне горада праходзяць інфармацыйна-адукацыйныя сустрэчы, прафілактычныя заняткі ва ўстановах адукацыі, рэалізуюцца праекты, скіраваныя на барацьбу з наркотыкамі, дэманструюцца дакументальныя фільмы ў кінатэатрах. Але наўрад ці можна назваць усе гэтыя крокі дзейснымі, хаця б таму, што няўмольная статыстыка сведчыць: цягам апошніх 25 гадоў колькасць хворых на наркаманію ў краіне і сталіцы толькі павялічваецца.

Як адзначыў **загадчык аддзела наркалогіі РНПЦ псіхічнага здароўя, дацэнт кафедры псіхіятрыі БДМУ Андрэй КАПЫТАЎ,** першаснымі прычынамі наркаспажывання сярод сучаснай моладзі з'яўляюцца не столькі сацыяльныя, колькі псіхалагічныя фактары. Падлеткі і студэнты прыходзяць да наркотыкаў праз дэпрэсіі, адчуванне трывогі, няўпэўненасці, а таксама вучэбную загружанасць. На думку нарколага, найбольш важнае месца ў змаганні з наркотыкамі павінна займаць прафілактыка, якую трэба праводзіць у мэтавых групах. На яе мусіць быць накіраваная нацыянальная палітыка і асвета. Доктар мяркуе, што найбольшы эфект у гэтым плане займеюць псіха-сексуальнае развіццё дзяцей, культура міжасабовых адносінаў, навыкі па тэхналогіі зносін і спосабах пераадолення стрэсу. Таксама выправіць становішча дапамогуць валанцёрскія рухі, сацыяльныя службы, моладзевыя арганізацыі, якія ў пастаянным рэжыме будуць праводзіць антынаркатычныя матывацыйныя акцыі.

Тое, што робіцца шмат, але разрознена, адзначыў і **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ.**

«Вынікі нашай працы фіксуюцца на паперы, але — мы сёння наведвалі рэанімацыю — як ішла плынь атручвання спайсамі, так і ідзе», — сказаў ён. Старшыня Мінгарвыканкама пераканаты, што патрэбны новы віток па рабоце з моладдзю, каб апошняя сама разумела шкоду, якую нясуць наркотыкі.

У сувязі з гэтым **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі гарвыканкама Павел СКАЛАБАН** прапанаваў стварыць студэнцкія валанцёрскія і медыцынскія атрады, якія будуць працаваць у бальніцах і рэабілітацыйных цэнтрах, праводзіць прафілактычную работу і агітаваць за здаровы лад жыцця.

На пасяджэнні востра прагучала пытанне пра тое, што сёння келіх піва больш даступны для падлетка, чым абанемент у спартыўную залу. Было выказана меркаванне, што спартыўныя секцыі для дзяцей павінны быць калі не бясплатнымі, то хаця б па кішэні.

У прывязцы да занятасці моладзі спрэчкі разгарэліся вакол працаўладкавання. Як адзначалі многія прысутныя на сустрэчы спецыялісты, працадаўцы сёння неахвотна бяруць у калектывы 16—17-гадовых, бо для іх неабходна арганізаваць асобыя ўмовы працы, скарочаны рабочы дзень. У выніку моладзь часта застаецца прадастаўленай сама сабе. Да таго ж, паводле заканадаўства, уладкоўвацца на працу малады чалавек можа з 16 гадоў, у той час як адказнасць за спайсы ў нас прадугледжана з 14-гадовага ўзросту.

Па выніках пасяджэння, заслухаўшы выступленні экспертаў і меркаванні дэпутатаў, Андрэй Шорац даручыў прадаставіць яму прапановы па супрацьстаянні наркотыкам да гэтай серады.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

Ад маленькіх спраў да вялікай любові

Актывісты БРСМ павіншавалі «валянцінкамі» сваіх куміраў і ўсю краіну

Дзень святога Валянціна, напэўна, з'яўляецца адным з самых «маладзёжных» свят. Відавочна, што абысці яго ўвагай не магла і найбуйнейшая маладзёжная арганізацыя краіны — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Актывісты БРСМ правялі сустрэчу пад назвай «Валянцінка твайму куміру», адно з цэнтральных мерапрыемстваў усебеларускай акцыі «За любімую Беларусь».

Фота БЕЛТА.

Падчас сустрэчы арганізатары ўрачыста перадавалі «валянцінкі», загадзя напісаныя і дасланыя хлопцамі і дзяўчатамі, адрасатам: артыстам, тэлевядучым, прадстаўнікам інтэлігенцыі, кіраўнікам органаў дзяржкіравання. Таксама кожны ахвотны мог пакінуць сваё пажаданне Беларусі на вялікім папяровым сэрцы або на яблыні — адным з сімвалаў 42-га з'езда арганізацыі.

— Так сталася, што моладзь вельмі актыўна падтрымлівае святкаванне 14 лютага, — сказаў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ» Андрэй БЕЛЯКОЎ,** — у гэты дзень прынята прызнавацца ў каханні, рабіць падарункі блізкім людзям. Але мы часта забываемся, што любоў — паняцце вельмі шырокае. Існуе любоў да сваёй прафесіі, да сваёй навучальнай установы, да свайго настаўніка, куміра... З гэтых маленькіх складнікаў утвараецца і любоў да сваёй Бацькаўшчыны. І гэтак жа з маленькіх спраў складаецца вялікая агульная справа на карысць Радзімы. Мы хочам, каб такіх спраў было болей.

Свае «валянцінкі» на сустрэчы атрымалі Іна Афанасьева, Святлана Бароўская, Уладзімір Кубышкін, Саша Нэма, Настасся Ціхановіч, Ганна Шаркунова і многія іншыя куміры моладзі. У адказ публіка пачула любімыя творы ў выкананні артыстаў. Акрамя гэтага, «зоркі» таксама пакінулі свае пажаданні на згаданай яблыні.

— У такі неспакойны час, як цяперашні, вельмі хочацца спадзявацца на светлую будучыню, на новыя адкрыцці, сустрэчы, перажыванні... І сёння я хачу пажадаць усім сапраўднага кахання, бо з-за кахання не толькі пачынаюцца войны, але і ўсталёўваецца мір, — пажадала ўдзельнікам мерапрыемства **спявачка, заслужаная артыстка Беларусі Іна АФАНАСЬЕВА.**

Кульмінацыяй мерапрыемства стала прэзентацыя 40-кілаграмовага торта ў форме вялікага сэрца, створанага рукамі кандытараў-актывістаў БРСМ. Кожны ахвотны змог пачаставацца кулінарным шэдэўрам.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

З ПСЕЎДАРАЗВЕДЧЫКАМ... ПА НАЧНЫМ ГОРАДЗЕ

У Лідзе псіхічна хворы сагнаў грузавік, паведамляе прэс-служба УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Сур'ёзных наступстваў удалося пазбегнуць дзякуючы пільнасці супрацоўнікаў патрульна-паставой службы, якіх насцярожыла манера кіравання машынай. Чалавека, які быў за рулём, даставілі ў райаддзел міліцыі, дзе высветлілася, што гэта інвалід другой групы па псіхічным захворванні. Аказалася, што 46-гадовы мясцовы жыхар каля гадзіны ночы прыйшоў на паркоўку, дзе звычайна стаяць грузавікі, разбудзіў кіроўцу аўтамабіля «Ман» і адрэкамендаваўся... супрацоўнікам разведкі. Прычым прыналежнасць да спецслужбы мянялася: то КДБ, то ЦРУ. Спрасонку дальнабойшчык нават не праверыў у «агента» дакументы. А той агледзеў груз, абшукаў кіроўцу, пасля чаго запатрабаваў скарыстацца гэтым транспартным сродкаў. Кіроўца сеў збоку, а зламыснік уладкаваўся за рулёў. І паехалі катацца па горадзе...

Дарэчы, у райаддзеле міліцыі затрыманы хоць і сазнаўся ва ўчыненым, але таксама казаў пра сілавыя структуры. Пры гэтым падзякаваў праваахоўнікам за пільнасць і запрасіў іх на службу ў разведку. Па факце згону аўтамабіля завялі крымінальную справу, а віноўніка ўжо накіравалі на лячэнне ў спецыялізаваную ўстанову.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

АТРУТНАЕ ЗЕЛЛЕ НА МІЛЬЯРД

40-гадовы жыхар Гомеля прывёз з Расіі на асабістым велікагрузным аўтамабілі не толькі легальны тавар, але і 19 мяшкоў з насваем. Гэтае зелле вырабляецца звычайна ў Цэнтральнай Азіі з тытуню, гашанай вапны, алею і курынага памёту.

Канфіскоўваць рэчыва давялося аператыўнікам міліцыі і падатковай інспекцыі. У прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама расказалі, што забароненае да рэалізацыі на тэрыторыі краіны зелле выявілі ў прычэпе машыны сярод пакетаў з палімернымі вырабамі. У момант затрымання гаспадар ужо паспеў загрузіць у аўтамабіль пакупніка адзін з мяшкоў з атрутай. Па ацэнцы аператыўнікаў, канфіскаваны насвай мог прынесці прыбытак аптоваму пастаўшчыку на суму больш за Br1 млрд.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У КАЦЕЛЬНІ ВЫБУХНУЛА. ЗАГІНУЎ ЧАЛАВЕК

У нядзелю ранкам у школьнай кацельні ў вёсцы Акцябр Лагойскага раёна выбухнуў кацёл. Быў смяротна траўмаваны мужчына.

Будынак кацельні 1993 года пабудовы стаіць асобна на адлегласці 300 метраў ад школы. У ім было два катлы: асноўны і рэзервовы. Выбухнуў менавіта апошні, які працаваў на цвёрдым паліве, паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. Асноўны кацёл быў спынены для прафілактычнага рамонту, на гэты час быў задзейнічаны рэзервовы. Мужчына, які ў той момант знаходзіўся ў памяшканні, паспрабаваў адкрыць засаўку, якая размешчана паміж асноўным і рэзервовым катламі. І якраз у гэты момант апошні выбухнуў. Выбуховай хваляй вяскоўца смяротна траўмавала. Была пашкоджана цагляная кладка асноўнага катла і аконныя праёмы, сам будынак не пацярпеў. Да прыбыцця падраздзяленняў МНС два качагары вынеслі загінулага на вуліцу.

У сувязі са здарэннем адбылося пазачарговае пасяджэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях пры Лагойскім райвыканкаме. Цягам усяго дня і ночы вяліся аднаўленчыя работы. 16 лютага ў 3.00 работа кацельні была адноўлена.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТОЕ, ШТО АБ'ЯДНОЎВАЕ

XXII Мінскую міжнародную кніжную выставу-кірмаш наведалі каля 35 тысяч чалавек

Мой персанальны вынік такі: 6 кніг, якія прынесла з выставы. Магло быць і больш — звярнуць увагу было на што. Часам нават да здзіўлення: нібыта такога і не чакаў убачыць, а вось жа яно ёсць. Унікальныя беларускія выданні, літаратура на беларускай мове, у тым ліку сучасных айчынных аўтараў. Сама беларуская мова — нават з боку краін-удзельніц, якія такім чынам дэманстравалі павагу да беларускай культуры (у прыватнасці, Вялікабрытанія і ЗША). Размовы пра развіццё айчыннай культуры, якая фарміравалася ў многім дзякуючы развіццю кнігадрукавання і кнігачытання. Пра неабходнасць сістэматызаваць веды пра сваю краіну — напрыклад, праз энцыклапедычныя выданні, пра што вялася гаворка на «круглым стале», арганізаваным выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Развагі пра ролю і месца пісьменніка ў сучасным свеце.

Сустрэчы з пісьменнікамі: такой колькасці гасцей, якія ствараюць літаратуру з розных краін, напэўна, не было ніколі. Некаторыя прыязджалі як госці міжнароднага сімпозіума літаратараў. Некаторыя з больш лакальнымі і канкрэтнымі мэтамі: дапамагчы сваёй краіне прадставіць яе кніжную культуру. Напрыклад, цікавых гасцей для сустрэч і тэмы для абмеркаванняў умеюць прапанаваць ля стэнда Францыі, дзе была ўтворана своеасаблівая «гасцёўня». Але ж вось сюрпрыз: на выставе можна было даведацца пра пераклад на французскую кнігі «Апошнія сведкі» Святланы Алексіевіч і нават паслухаць аўтара. Тут і там гучалі словы ў адрас беларускай літаратуры, якая ўзбагаціла сусветную культуру сваім вельмі балючым, але каштоўным вопытам разумення чалавечнасці, адметным поглядам на тое, што ёсць само жыццё... І гучалі імёны...

Кніг было шмат. Кошты месцамі нават вельмі дэмакратычныя. Некаторыя замежныя ўдзельнікі выстаўлялі вельмі зручныя курсы абмену (ля аднаго стэнда давялося пабачыць аб'яву пра тое, што 1 еўра на гэтай выставе роўны 15000 беларускіх рублёў) — шчасце для кнігалюбаў. І быў гандаль: удзельнікі павінны адчуваць, што прыязджаюць і выстаўляюцца нездарма...

Але плён ці сэнс падобных мерапрыемстваў усё ж не столькі ў рэальным даходзе, колькі ад зносін і перспектыўнага супрацоўніцтва. А выяўляцца яно можа па-рознаму. У адваротным запрашэнні на кніжныя кірмашы ў іншыя краіны — у прыватнасці, на кніжны салон, які праходзіць у Санкт-Пецярбургу. У планах па перакладзе і выданні кніг краін-партнёраў, як з Кітайскай Рэспублікай. Кніг не бывае зашмат — вырашалі людзі, якія сыходзілі з набыткамі ў торбах. Кніг не бывае зашмат, асабліва тады, калі, дзякуючы нашым гасцям, папаўняюцца фонды айчынных бібліятэк: за гэтыя дні мы атрымалі выданні з Кітая, Расіі, Германіі, Францыі і іншых краін. Штодня прэзентацыі, мерапрыемствы, сустрэчы, дыскусіі. Пах кніг у паветры, які прывабліваў людзей у выставачны цэнтр, дзе размясціліся стэнды з выданнямі. Колькасць зацікаўленых выставай людзей, аказваецца, можна было ацаніць. На закрыцці называліся лічбы: каля 35 тысяч гасцей за 5 дзён. Госці свае і замежныя, блізкія і здалёк, сябры і тыя, з кім мы толькі пачынаем знаёміцца праз кнігі. Тыя, хто кнігі стварае і выдае, і тыя, хто іх чытае. Іх — апошніх — трэба ведаць, шанаваць, клапаціцца. І з думкай пра іх найперш ладзіць далей кніжныя кірмашы. Сёння кожны чытач важны.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«УКЛАД У РАЗВІЦЦЁ КОЖНАГА КАНКРЭТНАГА ЧАЛАВЕКА»

Падсумоўваючы вынікі XXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія Ананіч адзначыла:

— Пяць дзён работы выставы прадэманстравалі інтарэс чытачоў і пацвердзілі, што кніга застаецца самай запатрабаванай крыніцай духоўнага развіцця грамадства, дзяржавы. У той час, калі ў свеце неспакойна, пісьменнікі закліканы абуджаць лепшае ў чалавеку. Сустрэча з разумным, жывым словам — гэта ўклад у развіццё кожнага канкрэтнага чалавека. Слова пісьменніка з'яўляецца запатрабаваным і ў XXI стагоддзі. Роля слова ў сучасным свеце асаблівая: яно павінна служыць міру і ўзаемаразуменню паміж людзьмі.

КОЖНЫ ЧАЛАВЕК ВАЛОДАЕ МАГУТНАЙ СІЛАЙ

Сярод імпрэз, якія завяршалі ў мінулую нядзелю XXII Мінскую міжнародную выстаўку-кірмаш, — і прэзентацыя кнігі Немата Келімбетава «Пісьмы сыну», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда».

Фота Кастуся ДРОБАВА.

На цэнтральнай пляцоўцы выставачнай экспазіцыі беларускіх выдавецтваў сабраліся прадстаўнікі розных краін, каб пагаварыць пра кнігу і яе аўтара — казахскага вучонага і пісьменніка. Немат Келімбетаў, філолаг па адукацыі, быў доўгі час прыкуты да ложка ў выніку невылечнага захворвання. Але час не марнаваў. Напісаў аповесць «Не хачу губляць надзею», у якой расказаў пра пакуты і сумненні хворага чалавека, пра вартасці мужнасці і адвагі ў барацьбе з цяжкімі наступствамі хваробы. Акрамя таго, стварыў сапраўдны летапіс вытокаў казахскай літаратуры, напісаў мноства навуковых работ. Завостраная публіцыстычная споведзь вучонага «Пісьмы сыну» — не проста дыялог бацькі з родным сынам, які паехаў у далёкі свет па навуку, а шчымлівыя, трапяткія, глыбокія развагі пра галоўныя прынцыпы жыцця, увогуле нашага існавання ў свеце. Далёкі ад дыдактычных памкненняў, аўтар вядзе нязмушаную гаворку пра гісторыю і традыцыі свайго народа, пра тое, як важна шанаваць продкаў, як трэба ставіцца да сямейных каштоўнасцяў. Кніга чытаецца надзвычай лёгка, уражвае багаццем мастацкіх параўнанняў і вобразаў. Кожны з раздзелаў «Пісьмаў...» — эмацыйнае, узнёслае мастацка-публіцыстычнае і выхаваўчае эсэ.

Пра тое, як перастваралася кніга на беларускую мову, расказаў **намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Алесь БАДАК.** Дырэктар маскоўскага выдавецтва «Художественная литература» Георгій Прахін падзяліўся чытацкімі ўражаннямі ад публіцыстыкі, мастацкіх твораў Немата Келімбетава. Дарэчы, яго кнігі выходзяць і ў іншых краінах свету. Пра гэта гаварыў на прэзентацыі азербайджанскі паэт Чынгіз Алі аглу. Ён спрычыніўся да выдання творчай спадчыны казахстанскага асветніка ў Азербайджане. Прадстаўніца Фонда Немата Келімбетава (Казахстан) пісьменніца Райхан Мажэнкызы перадала Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі цэлую бібліятэку выданняў «Не хачу губляць надзею» і «Пісьмаў сыну» на мовах народаў свету *(на фота)*. І выказала надзею, што ў Мінску яшчэ будуць выдадзены іншыя кнігі чалавека, чыё імя добра вядома ў краінах Азіі.

Застаецца дадаць, што Немат Келімбетаў — доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Акадэміі гуманітарных навук Казахстана, лаўрэат Міжнароднай прэміі ЮНЕСКА імя Франца Кафкі, заслужаны дзеяч навукі Казахстана.

Мікола БЕРЛЕЖ.

ТАВАРЫСТВА ЎЛЮБЁНЫХ

Кніга — лепшы падарунак. Аўтару, за перамогу ў літаратурным конкурсе

«Першая глава». Адкрываем, калі яшчэ не адкрылі: гэта літаратурны конкурс, які праводзіцца выдавецтвам «Рэгістр» (пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі) дзеля ўвагі да творчасці маладых літаратараў і пошуку твораў, якія могуць атрымаць увасабленне ў выглядзе кнігі. І атрымаюць: на Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы падведзены вынікі конкурсу «Першая глава», які адбываўся ўжо трэці раз. Пераможцаў узнагароджвалі ўрачыста на асноўнай пляцоўцы выставачнага цэнтра. Галоўны прыз за перамогу — права на выданне кнігі.

З чаго ўзнікаюць кнігі? Са старонак, спісаных словамі. З думак, якія ўнутры слоўнай абалонкі. З чалавека, які думкі нараджае і фармулюе. І з таго, што яго хвалюе ў свеце, пра што ён думае і хоча сказаць іншым. Але яшчэ і з цікавасці да гэтага асобнага чалавека як да аўтара, з жадання выдаць яго твор, прыцягнуць да чытання іншых. Асабліва складана гэта, калі аўтары маладыя і толькі імкнуцца заявіць пра сябе.

Вось каб даць ім такую магчымасць, каб аблегчыць выццё ў творчасці, падтрымаць (нават маральна), даць штуршок да развіцця, існуюць літаратурныя конкурсы: іх бывае шмат у розных краінах. У нас пакуль не надта многа. Але ж ёсць куды развівацца. І калі меркаваць па вопыце выдавецтва «Рэгістр», то конкурсы дапамагаюць знайсці новых аўтараў (а потым, можа, і выхаваць сваіх), з якімі можна ісці далей, прапаноўваючы чытачам іх кнігі. І вось жа вынік: сёлета на падвядзенні вынікаў «Першай главы» пераможца папярэдняга конкурсу Аксана Хвашчэўская прадставіла сваю дэбютную кнігу «Не каханне». Вокладка адразу прыцягвала ўвагу, і яшчэ да ўзнагароджання было зразумела: перамога для пісьменніка (ці таго, хто хоча ім стаць) — не столькі ў размеркаванні месцаў, фота на памяць, колькі ў кнізе, якую выдавецтва бярэцца выпусціць. Адпаведна, яно ж будзе зацікаўлена ў яе прэзентацыі, прасоўванні на рынку.

Андрэй КАРПУНІН, прадстаўнік выдавецтва «Рэгістр»; Алена ПАЎЛАВА, начальнік Упраўлення выдавецкай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Андрэй ЛАЗАР, пераможца ў намінацыі «Выбар прафесійнага журы» літаратурнага конкурсу «Першая глава».

Сёлета на конкурс «Першая глава» было пададзена каля 70 прац, 59 твораў было дапушчана да разгляду журы, у якое ўвайшлі пісьменнікі, сцэнарысты, прадстаўнікі выдавецтва. Ёсць у гэтым конкурсе асаблівасць: удзельнікі прапаноўваюць толькі ўрывак з твора, не раскрываючы ўсіх магчымых сюжэтных ліній ці варыянтаў. Гэта хутчэй заяўка на твор, але і яна можа зацягнуць, зацікавіць, за ёй павінна адчувацца перспектыва. Яе могуць адчуць нават патэнцыйныя чытачы.

Са спадзяваннем на гэта існуе, напрыклад, такая намінацыя, як «Выбар чытачоў». Яны галасавалі даволі актыўна (арганізатары дазволілі гэта зрабіць нават з дапамогай сучасных тэхналогій, напрыклад, у сацыяльных сетках можна было пад упадабаным урыўкам паставіць «лайк»). Але потым выбіраўся сярэдні бал сярод усіх, хто прагаласаваў. Большую колькасць агульных балаў атрымала Настасся Трушнікава з Бабруйска за аповесць «Неадпраўленыя лісты».

У намінацыі «Выбар рэдакцыі» ўлічваецца ў большай ступені выдавецкі момант: вызначаецца твор, якія найбольш прыцягнуў увагу супрацоўнікаў выдавецтва і які можа мець добрую будучыню, калі ўвасобіцца ў кнізе. Перамогу (і дыплом) у гэтай намінацыі здабыла мінчанка Алена Занкавец за ўрывак рамана «Дзясятае жаданне».

Самая адказная намінацыя — «Выбар прафесійнага журы». Пераможца таксама вызначаецца шляхам галасавання (кожны з членаў журы выстаўляе сваю адзнаку за твор). І тут адыгрывае ролю абсалютна ўсё: тэма твору, магчымае развіццё (калі ён не скончаны). Дзеля гэтага, напрыклад, арганізатары часам звярталіся да магчымых лаўрэатаў з просьбай даслаць больш тэксту, чым першапачатковы ўрывак. Але бывае, ідэя будучай кнігі ці тое, што напісана, ужо інтрыгуе, асабліва ў рамках кніжнай выставы. «Таварыства кнігалюбаў» — тэма будучай кнігі мінчаніна Андрэя Лазара. Тэма кнігі, якая абавязкова з'явіцца — як абяцаны падарунак аўтару за перамогу ў конкурсе «Першая глава». Прыемна і тое, што гэта будзе кніга на беларускай мове.

Андрэй ЛАЗАР, сціплы малады чалавек, не ўтойваў хвалявання нават пасля ўрачыстага віншавання з узнагародай. І нават здавалася, што яна стала для яго новай падставай для хваляванняў: над кнігай жа далей працаваць. На пытанне «Звязды» ён адказаў так:

— Конкурсы могуць з'яўляцца штуршком для многіх людзей: паспрабаваць сябе ў гэтым кірунку, адчуць сябе аўтарам, зрабіць першы крок. Часам гэта бывае цяжка. Чым больш конкурсаў, тым больш магчымасцяў у творцаў. Таму што гаворка пра выданне кнігі, што для маладых аўтараў вельмі важна. Таму добра, што ініцыятарам і арганізатарам конкурсу стала выдавецтва: гарантыя таго, што лепшыя творы пабачаць свет. У мяне была заяўлена аповесць, але гэта толькі першая частка. Падзеі адбываюцца ў будучыні, але раскрываць іх не буду — давайце пачакаем кнігі.

Прадстаўнікі выдавецтва «Рэгістр» адзначаюць, што з кожным годам узровень работ, якія падаюцца на разгляд, расце. Акрамя таго, сёлета было значна больш твораў на беларускай мове. Нават сярод лепшых дзве работы былі напісаны па-беларуску. І гэта «Першая глава». Працяг будзе. А можа будуць дадавацца і іншыя варыянты пошуку і ўвагі да айчынных літаратараў, якія пашыраць наша ўяўленне пра ўласную культурную прастору.

Ларыса ЦІМОШЫК.

НЕ СТРАЦІЛІ ГОНАР САЛДАТА

Традыцыйна ў Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў на Востраве мужнасці і смутку ў Мінску было мнагалюдна. На жалобным мітынгу, прысвечаным 26-й гадавіне вываду савецкіх войск з Афганістана, сабраліся ўдзельнікі той вайны, родныя загінулых салдат, найвышэйшыя службовыя асобы краіны.

У вайне, якая доўжылася амаль дзесяцігоддзе, удзельнічала больш за 30 тысяч беларусаў. Каля 800 з іх не вярнуліся дамоў. У іх гонар да помніка афганцам усклалі кветкі. Памяць загінулых ушанавалі хвілінай маўчання. Зварот Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі да воінаў-інтэрнацыяналістаў зачытаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ.**

— Воіны-інтэрнацыяналісты з'яўляюцца прыкладам грамадзянскага подзвігу і службы сваёй Айчыне, — падкрэсліў **міністр абароны генерал-маёр Андрэй РАЎКОЎ**. — Вайну ў Афганістане цяпер называюць першай антытэрарыстычнай аперацыяй. Магчыма, гэта і правільна. У ёй нашы суайчыннікі праявілі мужнасць і адвагу, найлепшыя якасці патрыёта і грамадзяніна сваёй краіны. Яны былі вернымі сваёй прысязе, калі выконвалі гэты абавязак.

Як паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па нацыянальнай бяспецы, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Валерый ГАЙДУКЕВІЧ**, улада заўсёды ідзе насустрач воінам-інтэрнацыяналістам пры вырашэнні шматлікіх праблем. «Вядома, ёсць праблемы, якімі патрэбна займацца: гэта пытанні, звязаныя з пенсійным або медыцынскім забеспячэннем, — патлумачыў ён. — Людзі, што прайшлі вайну, павінны мець пэўную перавагу над іншымі грамадзянамі. Мы імкнёмся падымаць і вырашаць гэтыя праблемы. Цяпер гучыць шмат неадназначных ацэнак падзей у Афганістане. Але мы, удзельнікі вайны, добра ведаем, што годна выканалі загад Радзімы і не страцілі гонар савецкага салдата».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Узгадваю той час, і ўзнікае такое пачуццё, быццам пераглядваю кінахроніку, — падзяліўся ўспамінамі Валерый Гайдукевіч, сам воін-інтэрнацыяналіст. — Шмат было моментаў і кур'ёзных, і складаных. Калі вярнуўся дамоў, радаваўся, што застаўся жывы і, нарэшце, у родных месцах. Першы дзень мой сын хадзіў вакол мяне, а потым забраўся на калені і спытаў: «Ты мой тата?» У гэты момант я разгубіўся і не ведаў, што адказаць...

Дарэчы, частка набярэжнай ракі Свіслач ад Вострава мужнасці і смутку да гасцініцы «Беларусь» зараз называецца набярэжнай Воінаў-інтэрнацыяналістаў. Такое рашэнне было прынята дэпутатамі на пазачарговай сесіі Мінгарсавета. Ініцыятарам наймення выступіла мінская гарадская арганізацыя ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць».

— Гэта яшчэ адзін сімвал памяці, які назаўсёды будзе жыць у сэрцах, бо гісторыя той вайны напісана крывёй нашых суайчыннікаў і слязьмі іх мацярэй, — зазначыў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар КАРПЕНКА**. — Мы ганарымся нашымі героямі, якія з гонарам і годнасцю выканалі свой інтэрнацыянальны абавязак. Гарвыканкам, адміністрацыі раёнаў сталіцы сумесна з ветэранскімі арганізацыямі будуць працягваць працу па ўвекавечванні памяці пра загінулых. Яна вельмі важная і з пункту гледжання данясення гістарычнай праўды, і з пункту гледжання выхавання грамадзянскай свядомасці ў падрастаючага пакалення.

Вераніка КАНЮТА.

70 ГОД 1945-2015 Вялікай Перамогі

«СПАРТАК» СУПРАЦЬ АБВЕРА...

Чым далей адыходзяць у мінулае гады Вялікай Айчыннай вайны, тым больш сціраюцца з памяці асобныя фрагменты фактаў, успамінаў і дакументаў, якія распавядаюць пра час найстрашнейшага супрацьстаяння і барацьбы за жыццё. Сярод тых, хто «каваў» Вялікую Перамогу ў тыле ворага, былі і байцы партызанскай брыгады «Спартак». І ў кожнага з іх — сваё жыццё, свой лёс...

АДЫХОД НА ЎСХОД

Пачатак вайны застаў будучага партызана Спартака Фёдара Конышава ў Сапоткінскім раёне Беластоцкай вобласці, дзе ён працаваў памочнікам пракурора. На досвітку 22 чэрвеня 1941 года нямецкія самалёты пачалі бязлітасна бамбіць райцэнтр. Трэба было неадкладна адыходзіць. Прабіраючыся палямі і лясамі, уцекачы пад вечар выйшлі на шашу Гродна—Маладзечна, якую фашысцкія «штукас» без перапынку палівалі з паветра свінцом. На ўсё жыццё запомніў Фёдар Конышаў гэты страшны дзень.

З разрозненымі часцямі Заходняга фронту і цяжарнай жонкай ён усё далей адыходзіў на Усход. Як ні спяшаліся Конышавы, аднак у мястэчку Юрацішкі ў невялікім доміку ім давялося затрымацца. У жонкі пачаліся роды. Так на свет з'явілася дачка Света. Ухутаўшы малую ў кашулю мужа, Конышавы працягнулі свой небяспечны шлях. Галодныя і босыя, з крывавымі мазалямі на нагах, муж і жонка нарэшце дабраліся да вёскі Ляхаўка Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці і прыйшлі ў дом бацькі Фёдара. Там на час і спыніліся.

Неўзабаве цішыню разарваў аглушальны выбух і грукат састава, які паляцеў пад адхон... Акупанты страцілі 10 вагонаў, 10 платформаў, 18 танкаў, 6 гармат і вялікую колькасць жывой сілы.

Але вораг з яго апаратам сачэння і даносаў не драмаў. Ужо на трэція суткі ў доме бацькоў з'явіліся немцы і мясцовыя паліцаі-«бобікі». На шчасце, Фёдара на месцы не аказалася. Акупанты зрабілі вобыск, і, сыходзячы, загадалі прывесці былога пачмочніка пракурора ў райцэнтр. Але пра гэта, натуральна, не магло быць і гаворкі.

Перайшоўшы на нелегальнае становішча, Фёдар Конышаў здолеў усталяваць сувязь з падпольшчыкамі, а ў лютаўскую ноч 1942 года ўступіў у партызанскі атрад, пазней рэарганізаваны ў 2-ю Беларускую партызанскую брыгаду. Толькі пазней Конышаў даведаўся, што гітлераўцы цалкам знішчылі яго род. Яны спалілі і расстралялі блізкіх і далёкіх сваякоў (усяго 33 чалавекі), у тым ліку 75-гадовага бацьку, 70-гадовую маці, двух сясцёр, жонку і дачку-немаўля.

100 ТЫСЯЧ І ДВА ПУДЫ СОЛІ

У маі 1942 года ўзвод пад камандаваннем Фёдара Конышава арганізаваў засаду на ўскрайку вёскі Кузьміно. Група асабліва лютуючых у раёне паліцаяў з 15 чалавек знайшла тут сваю пагібель. У чэрвені ў складзе партызанскай брыгады ён прыняў удзел у нападзе на станцыю Бычыха, размешчаную на чыгунцы Віцебск—Ленінград. Палітрук ішоў у першых радах партызан. Варожы гарнізон быў разгромлены, на шляхах засталіся знішчаныя эшалоны.

У ноч на 29 жніўня 1942 года ўзвод партызан пад камандаваннем малодшага лейтэнанта Гумарава і палітрука Конышава разграміў паліцэйскі гарнізон колькасцю 60 чалавек у мястэчку Казьяны. У далейшым партызанскай групай Фёдара Конышава былі ўзарваныя тры масты цераз Дзісну, спалены маслазавод, канфіскаваны ў ворага і раздадзены насельніцтву хлеб, разгромлены варожы гарнізон у пасёлку Плацерава. У раёне дыслакацыі атрада акупанты сталі адчуваць сябе, як на парахавой бочцы. Удары па іх наносіліся адзін за адным.

У атрад штодня прыходзілі ўсё новыя і новыя маладыя байцы. За кароткі час ён вырас да 400 чалавек. Неўзабаве была сфарміравана брыгада «Спартак» пад камандаваннем афіцэра РККА А.М. Панамарова. Намеснікам камандзіра брыгады па разведцы прызначылі Фёдара Конышава. Разведчыкі пад яго камандаваннем пачалі з'яўляцца ў гарадах і сёлах Літвы і Латвіі. Арганізоўвалася антыфашысцкае падполле ў беларускіх вёсках Відзы, Казьяны, Азяраны, Мілашкі, а таксама ў гарадах Літвы — Швянчонісе, Вільнюсе. Туды дастаўляліся лістоўкі, узрыўчатка. Адусюль Конышаў атрымліваў важную інфармацыю аб планах ворага і яго сілах.

У пачатку кастрычніка 1942 года ад разведчыка Афанасія Самойлава з Швянчоніса паступіла паведамленне пра інтэнсіўнае перакідванне па чыгунцы Вільнюс—Даўгаўпілс эшалонаў з танкамі і жывой сілай праціўніка. І ўжо 10 кастрычніка Конышаў павёў дыверсійную групу ў раён станцыі Ігналіна. Цяжкія 60 кіламетраў падрыўнікі прайшлі за дзве ночы, прабіраючыся па балотах і лясных сцяжынках, несучы ў рэчмяшках міны. Яны залеглі ў густым хмызняку ля крутога насыпу палатна чыгункі, уздоўж якой хадзілі нямецкія вартаўнікі. Чаканне партызан было доўгім. Але вось пачуўся далёкі гул эшалона. І як толькі чарговы патруль мінуў засаду, Місунас, Конышаў і Голубеў тут жа ўсталявалі дзесяцікілаграмовую толавую міну. Неўзабаве цішыню разарваў аглушальны выбух і грукат састава, які паляцеў пад адхон... Акупанты страцілі 10 вагонаў, 10 платформаў, 18 танкаў, 6 гармат і вялікую колькасць жывой сілы.

Рух па гэтай дарозе быў спынены на трое сутак. Дыверсія ў раёне станцыі Ігналіна не на жарт устрывожыла акупантаў. Нацысцкія спецслужбы даведаліся, што яе ажыццявіла група пад камандаваннем Конышава. Яны абяцалі 100 тысяч рублёў і два пуды солі таму, хто даставіць ім яго жывым або мёртвым.

НЯМЕЦКІ ЗАСЛАНЕЦ

Літоўскія партызаны разам з беларускімі ўдзельнічалі ў разгроме нацысцкай карнай экспедыцыі ў Казьянскіх лясах. Больш за 60 салдат і афіцэраў, не лічачы параненых, страцілі карнікі ў гэтых баях... Неяк улетку 1943 года партызан Павел Шацёнак адвёў Конышава ўбок і паведаміў, што, па яго назіраннях, не так даўно прыняты ў атрад Пятроў паводзіць сябе неяк дзіўна. Два разы, вяртаючыся з задання, ён адставаў ад хлопцаў і даганяў іх амаль ля самага лагера. Куды і навошта ён адлучаўся?

Пачаткоўцаў у атрадзе абавязкова правяралі, яны ўдзельнічалі ў баявых аперацыях. За Пятровым нічога заганнага заўважана не было. І ўсё ж з гэтага часу партызаны былі праінструктаваны назіраць за Пятровым. А ён нярэдка распавядаў, што збег з лагера ваеннапалонных, хаця зусім не быў падобны на згаладалага чалавека. Сцвярджаў таксама, што ў лагеры яго накіроўвалі на цяжкія работы, аднак мазалі, драпіны і сінякі на руках былі свежымі...

Неўзабаве было заўважана, што Пятроў спакваля, але даволі ўважліва прыслухоўваецца да любых размоў камандзіраў паміж сабой, асабліва калі гаворка заходзіць пра радыёсувязь з Масквой і атрыманні адтуль указанняў, стараецца даведацца, хто з мясцовага насельніцтва падтрымлівае сувязь з партызанамі, хто па іх заданнях ходзіць у гарнізоны праціўніка. Аднак падазрэнні — гэта толькі падазрэнні. Для Конышава з яго пракурорскім вопытам патрэбны былі неабвержныя доказы. І, нарэшце, ён іх атрымаў. Той жа Павел Шацёнак неяк уначы выявіў, што Пятроў, які ляжаў побач з ім, раптам падняўся з нараў, пасядзеў трохі, а потым ціха выслізнуў з зямлянкі. Павел вырашыў прасачыць за ім. Пятроў ішоў, спыняючыся і азіраючыся па баках, прыслухваючыся. Прайшоўшы з паўкіламетра, ён лёг на зямлю і стаіўся. Не заўважыўшы нічога падазронага, устаў, падышоў да вывернутай елкі і дастаў з карэнішчаў нешта, загорнутае ў анучу. Разгарнуў скрутак і... надзеў навушнікі.

Неверагодна! Ды гэта ж рацыя! Шацёнак адразу ўсё зразумеў і, выконваючы меры засцярогі, рушыў назад. Маментальна былі паднятыя разведчыкі, якія акружылі Пятрова. Ён, дарэчы, так захапіўся рацыяй, што нават і не заўважыў, як тыя падышлі да яго ўжо ўшчыльную. Злоўлены з доказамі злачынства «Пятроў» асабліва таіцца не стаў, лічачы, што гэтым выратуе сабе жыццё. Як аказалася, у рукі партызан трапіла «буйная птушка». Па нацыянальнасці «Пятроў» быў... немцам, які скончыў у Берліне дыверсійна-разведвальную школу Абвера. І імя яго было Арвід Хешке. Нямала людзей загінулі падчас яго «бліцукаранення» ў падполле.

Партызанскі суд пасля дасканалага высвятлення ўсіх дэталяў адплаціў шпіёну па заслугах. Зрэшты, як і пяці іншым агентам нацысцкіх спецслужбаў з ліку мясцовых.

...Пасля доўгачаканага вызвалення Беларусі ў ліпені 1944 года Фёдар Конышаў быў накіраваны на працу пракурорам Відзаўскага раёна, а затым працаваў у органах пракуратуры Маладзечанскай, Полацкай, Віцебскай абласцей, з 1970 года — пракурорам горада Полацка. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ён быў узнагароджаны ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I-й і II-й ступені, «За баявыя заслугі» і іншымі ўзнагародамі.

Мікалай СМІРНОЎ

Навукоўцы «сталі» на крыло

«БУРАВЕСНІК» — ПТУШКА ТРЫВАЛАЯ

Летась інстытут прэзентаваў новую распрацоўку — беспілотны комплекс далёкага дзеяння «Буравеснік». Радыус прымянення яго складае да 290 кіламетраў ад пункта аператара. Ужо сёлета прагназуецца серыйны выпуск такіх комплексаў. У гэтым упэўнены Юрый Яцына. Паводле яго слоў, беспілотнік можа знаходзіцца ў паветры да 10 гадзін і падымацца на вышыню каля 5 тысяч метраў. Хуткасць палёту гэтага самалёта вагаецца ад 80 да 240 кіламетраў у гадзіну. Максімальная ўзлётная вага апарата складае 200-240 кілаграмаў, а карысная нагрузка павялічваецца да 50-70 кг.

Апарат можа выкарыстоўвацца для вядзення разведкі, выяўлення надзвычайных сітуацый і ацэнкі іх развіцця, маніторынгу сельскагаспадарчых угоддзяў. З дапамогай комплексу ў далейшым можна будзе назіраць за радыяцыйнай абстаноўкай у раёне нашай атамнай электрастанцыі. Такія БАКі могуць якасна назіраць за станам нафта- і газаправодаў, ажыццяўляць кантроль за дзяржаўнай мяжой і змагацца з браканьерамі.

Юрый ЯЦЫНА ганарыцца сваім «Буравеснікам».

ПЕРШЫ ЦЯЖКІ БЕСПІЛОТНІК «ПРАПІШАЦЦА» Ў ЛІПКАХ

Кіраўніцтва інстытута разлічвае ўжо ў другой палове года паставіць поўны набор абсталявання БАКа з планёрам «Буравеснік» у сістэму маніторынгу МНС. Для выратавальнікаў плануецца зрабіць наземны пункт кіравання апаратам і стацыянарны комплекс апрацоўкі інфармацыі ў Ліпках. У ідэале дыспетчар потым зможа на шасці экранах назіраць за паказчыкамі да 50 параметраў разумнага беспілотніка. Потым рэтрансляцыя ўсёй неабходнай інфармацыі ўжо ў лічбавым фармаце будзе ажыццяўляцца іншым спажыўцам.

ЦІХАХОДНЫ НАЗІРАЛЬНІК

На пляцоўцы інстытута ў Мінску распрацаваны выпуск комплексаў экалагічнага маніторынгу на базе дырыжабля (БАК ЭМ). Даўжыня яго расцягнутай сферы складае каля 10 метраў з дыяметрам да 3 метраў. Беспілотны дырыжабль напоўнены геліем і здольны пры ўмове знаходжання ў паветры ў штыль і хуткасці ветру да 3,7 м/с працаваць да 11 гадзін.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

БАК ЭМ валодае цэлым шэрагам пераваг: хуткасць палёту складае ад 0 да 40 км/г, а пры ёй значна палягчаецца задача назірання за мясцовасцю з густой расліннасцю, скрозь кроны дрэў і хмызнякі. Можна разгледзець аб'екты ў драбнютках дэталях і сфарміраваць выразную карцінку, плюс нізкае спажыванне энергіі, дзякуючы якому ён можа даўжэй выконваць пастаўленыя задачы. Першы зроблены намі дырыжабль быў прададзены Расіі, якая сёлета збіраецца купіць яшчэ адзін.

ЧАС ЗАРАБЛЯЦЬ НА ІНАВАЦЫЯХ

У Беларусі лятаюць два беспілотнікі, створаныя ў НПЦ «БАК і тэхналогіі», яшчэ шэсць працуюць за мяжой. Сёлета статыстыка зменіцца, але гэта не значыць, што ў нас стане больш такіх машын, чым за мяжой. Юрый Яцына адзначыў, што цэнтр сёння выконвае чарговы экспартны кантракт — спецыялісты збіраюць чатыры беспілотнікі класа міні.

Кіраўнік цэнтра паведаміў, што аб'ём рынку беспілотнікаў у свеце сёння складае каля 10 млрд долараў у год. А летась інстытут зарабіў на беспілотных комплексах каля 650 тысяч долараў. Атрымліваецца, што перспектыва ў нашых навукоўцаў па гэтым накірунку сапраўды ёсць. Сёлета ў цэнтра толькі падпісаных кантрактаў ужо значна больш. Цяпер спецыялісты разлічваюць зарабіць на беспілотніках каля 4 млн долараў. Асноўныя заказчыкі такіх комплексаў — Расія і краіны Азіяцкага і Ціхаакіянскага рэгіёнаў. Аднак заказчыкі бываюць розныя. Цікава, а прадасць інстытут свае комплексы прыватнай кампаніі ці асобе?

— У прынцыпе ўсё магчыма, — паведамляе спадар Яцына. — Галоўнае, каб у прыватнай структуры была адпаведная ліцэнзія на выкарыстанне гэтых апаратаў. Такія ўмовы з нашага боку прапісаны ў кантракце. Таму ніякія паўшпіёнскія ці бандыцкія арганізацыі беларускія крылы набыць не змогуць, — удакладніў пазіцыю цэнтра яго кіраўнік.

Першы зроблены намі дырыжабль быў прададзены Расіі, якая сёлета збіраецца купіць яшчэ адзін.

За мяжой нашы беспілотнікі цяпер заказваюць галоўным чынам пагранічнікі. Менавіта ў сённяшні неспакойны час ахова мяжы робіцца вельмі актуальным напрамкам у сферы нацыянальнай бяспекі. Набываюць комплексы і работнікі мытні, якім з паветра значна прасцей сачыць за магчымым перасоўваннем кантрабанды. У асобных заказчыкаў лініі сувязі і электрычнасці маюць даўжыню каля тысячы кіламетраў, а дарог там няма. Каб толькі адшукаць месца абрыву такой лініі, трэба мець вялікую брыгаду з моцным аўтатранспартам. А беспілотнікі выконваюць такую задачу за 2-3 дні.

«Ніякія паўшпіёнскія ці бандыцкія арганізацыі беларускія крылы набыць не змогуць».

Паводле слоў спадара Яцыны, вырабляць і экспартаваць падобныя комплексы выгадна. «У такой машыне мала матэрыялаў, мала энергетыкі, але вельмі шмат навукі. У адной маленькай «птушачцы» сабраны найлепшыя тэхналогіі. Вырабляць беспілотнікі могуць толькі краіны з высокім навуковым і тэхналагічным патэнцыялам. Мы ім валодаем», — падкрэсліў начальнік цэнтра.

На зборку такога апарата, як «Бусел», неабходна каля двух тыдняў пры ўмове наяўнасці ўсіх камплектуючых. А збіраць яго трэба вельмі старанна. Напрыклад, кожны такі апарат пры яго праектаванні правяраецца ў віртуальнай аэрадынамічнай трубе, а пасля вырабу планёраў вымярэнне іх элементаў праходзіць з ювелірнай дакладнасцю пры параўнанні з эталонам.

Яшчэ адна вялікая перавага — багаты вопыт, назапашаны інстытутам у вытворчасці розных матэрыялаў, якія валодаюць унікальнымі ўласцівасцямі. Таму айчынныя беспілотнікі вельмі лёгкія, але пры гэтым даволі моцныя. А яшчэ ў інстытуце ёсць сапраўды высокакваліфікаваныя матэматыкі, што распрацоўвалі сістэму дыстанцыйнага кіравання апаратамі. Сёння ўся электроніка штучнага пілота змяшчаецца ў невялікую скрыню вагой меншай за 100 грамаў.

КАШМАР БРАКАНЬЕРАЎ І НЕ ТОЛЬКІ

Беларускія БАКі малой далёкасці адразу выпрабоўвалі над ляснымі масівамі. У свой час шмат ляталі і над Бярэзінскім запаведнікам. Потым работнікі гэтай установы паведамлялі, што пасля палётаў «Буслоў» там браканьераў ніхто не бачыў на працягу некалькіх месяцаў.

На мінулым тыдні пабываў на малой радзіме жонкі — у Лепелі. Азёраў там шмат і рыбы хапае. А вось сеткамі мясцовыя жыхары тут ужо не ловяць. Ім на сумленне зверху «давіць» маленькі самалёцік, які ўсё здымае. Над азёрамі летась «Буслы» ляталі толькі некалькі разоў, але гэтага хапіла. Невялікага белага беспілотніка на вышыні звыш 150 метраў з зямлі ўжо не заўважыш і не пачуеш. А здыме такі буслік — і ўсё: суд потым аштрафуе «напоўніцу».

Пры вытворчасці БАКаў класа міні работнікі інстытута выкарыстоўваюць прыкладна 80% беларускіх камплектуючых.

Фотаздымкі ў беспілотнікаў атрымліваюцца і сапраўды якасныя, як расказвае Юрый Яцына. На іх зімой каля лесу ў снезе можна заўважыць сляды зайцоў.

Актыўна пачалі выкарыстоўваць авіяцыйныя комплексы і службы МУС. Летась толькі за адзін вылет «Бусла» над Налібоцкай пушчай там было выяўлена 5 кропак самагонаварэння. Паспяхова выкарыстоўвалі БАКі і ўначы. Тады пагранічнікі на мяжы з Літвой заўважылі адразу 11 нелегалаў.

Падобныя авіяцыйныя комплексы далёкага дзеяння ва ўсіх краінах маюць двайное прызначэнне, у тым ліку ваеннае. А тут у нашых БАКаў існуюць пэўныя перавагі, бо акустычнымі і іншымі прыстасаваннямі супрацьпаветранай абароны беларускія беспілотнікі заўважыць немагчыма. Планёры зроблены з айчыннага матэрыялу з выкарыстаннем нанатэхналогій, таму для радараў яны празрыстыя.

Сяргей КУРКАЧ.

Без афарбоўкі дырыжабль нагадвае маленькае воблачка.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Факт

ІНФЛЯЦЫЯ Ў СТУДЗЕНІ СКЛАЛА 2,4%

Такім чынам індэкс спажывецкіх цэн на харчовыя тавары ў параўнанні са снежнем склаў 101,8%, на нехарчовыя — 102,4%, а паслугі за гэты час падаражэлі на 3,9%. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Нацыянальнага статыстычнага камітэта.

Трэба адзначыць, што за мінулы месяц цэны на мясцовыя прадукты амаль не змяніліся, а па мясе птушкі, каўбасных вырабах, малацэ і муцэ яны нават крыху знізіліся на 0,1-0,3%. Разам з тым, за месяц ажно на 22% падаражэла гародніна і на 16,4% — садавіна. Дзіўна, але адразу на 6% у студзені падаражэла бульба, толькі на 4% — чай і на 4-5% падраслі цэннікі на рыбу і алей.

Сярод нехарчовых тавараў больш за ўсё падаражэлі веласіпеды і матацыклы (плюс 9,3%), бензін — на 4,6%, бытавыя электратавары (2,7%) і медыкаменты (2,2%). Прыкладна на 5% павялічыліся тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, дзе электрычнасць падаражэла адразу на 5,8%, газазабеспячэнне — на 4,8%, а водазабеспячэнне — на 3,8%.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Меркаванне эксперта

СВАЁ ЗАЎСЁДЫ ЛЕПШАЕ

У якім становішчы эканоміка ў Беларусі? Ці варта рабіць дэнамінацыю? Якія самыя эфектыўныя метады стрымлівання інфляцыі? Ці ёсць неабходнасць скарачаць валютныя разлікі ўнутры краіны? Пра гэта распавяла загадчыца кафедры эканамічнай тэорыі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук, прафесар Ірына НОВІКАВА.

Адмаўляемся ад валюты?

Як патлумачыла эксперт, у расіян даўно ўжо адбылася дэдаларызацыя эканомікі. Гэта варта зрабіць і ў Беларусі, пры ўмове, што насельніцтву заўсёды будзе даступны набор неабходных тавараў, якія можна будзе набыць за беларускія рублі.

«Калі можна купіць усе неабходныя тавары за свае грошы, то і давер да рубля ўзрастае», — адзначыла прафесар.

Дэнамінацыі быць?

Па словах Ірыны Новікавай, дэнамінацыя на гэтым этапе не дапаможа павысіць давер да беларускага рубля. Хаця, на думку дзелавой супольнасці, гэта будзе адным з крокаў па дэдаларызацыі эканомікі і павысіць давер да нацыянальнай валюты.

«Дэнамінацыя — гэта тэхнічная, але досыць дарагая аперацыя. Можна яе правесці, але калі эканоміка ў нестабільным стане, то праз нейкі час зноў давядзецца дапісваць нулі», — пракаментавала прафесар.

Сітуацыю ў беларускай эканоміцы стабільнай пакуль не назавеш, таму, на думку эксперта, праводзіць дэнамінацыю сёння няма неабходнасці.

Што стрымлівае інфляцыю?

Як тлумачыць прафесар, асноўны метад стрымлівання інфляцыі — кантроль цэн. Беларусь у гэтым кірунку арыентуецца на расійскі вопыт. Ірына Новікава падкрэсліла, што гэта асноўны метад, які дазволіць не дапусціць сацыяльнай напружанасці ва ўмовах, калі рост заработнай платы прывязаны да прадукцыйнасці працы. Калі адпусціць цэны на тавары, якія вырабляюцца манапалістамі, яны могуць вырасці ў разы.

«У гэтай сітуацыі ў сувязі з тым, што стрымліваецца інфляцыя, можна стымуляваць развіццё малога бізнесу менавіта ў тых сектарах, дзе пакуль ёсць недахоп тых ці іншых тавараў», — мяркуе эксперт.

Мадэрнізацыю трэба паскараць

Эканоміку краіны можна ахарактарызаваць як малую і адкрытую. Гэта азначае, што на Беларусь уплывае мноства знешніх фактараў, а яна на іх паўплываць не можа. Таму, калі мы гаворым пра знешні таваразварот, трэба ўлічваць, што 45% рынку знаходзіцца ў Расіі і каля 20% — ва Украіне, дзе сітуацыі таксама цяпер вельмі нестабільныя.

«Але нават у выпадку, калі б усё рэзка стабілізавалася, гэта не значыць, што нашы тавары будуць там запатрабаваны, як раней. Нам неабходна думаць аб мадэрнізацыі нашых прадпрыемстваў. Нашым суседзям не патрэбна прадукцыя сярэднетэхналагічнай вытворчасці. Мадэрнізацыю трэба паскараць, і шукаць новыя напрамкі», — лічыць Ірына Новікава.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

■ А вы чулі?

СЫР ПАЧЫРВАНЕЎ...

Але не ад сораму, а ад памідораў

Элітны чырвоны сыр будзе выпускаць Любанскі філіял «Слуцкага сыраробнага камбіната». Назву яму далі ў гонар галандскага аналага «Pesto Rosso». Новы смак атрымліваецца за кошт часнаку і сухіх таматаў. Апошні інгрэдыент надасць сыру чырвоны колер, што, на думку маркетолагаў, павінна прыцягнуць увагу спажыўца.

Тэрмін паспявання сыру складае 60 сутак. Як растлумачылі на прадпрыемстве, у продаж сыр павінен паступіць вельмі хутка. Цяпер, па словах прадстаўнікоў аддзела збыту, будзе вывучацца попыт на новы прадукт сярод беларускіх пакупнікоў. Таксама не выключаецца, што ў будучыні будуць ажыццяўляцца экспартныя пастаўкі.

«Тэхналогія сыру з'яўляецца нашым ноу-хау. Мы распрацавалі яе з пастаўшчыком заквасак. Назва выбрана невыпадкова і асацыюецца з галандскім сырам чырвонага колеру. Падобны сыр робяць таксама ў Гродне. Аднак у Галандыі, як і ў Гродне, у сыр дадаюць спецыі, а мы ў якасці асноўнага інгрэдыенту выкарыстоўваем сухі тамат. Сёння першая партыя сыру яшчэ знаходзіцца ў працэсе паспявання», — адзначыла **начальнік вытворчасці Любанскага філіяла Слуцкага сыраробнага камбіната Вольга РЫТВІНСКАЯ.** Таксама, паводле яе слоў, спажыўцоў у бліжэйшы час чакае яшчэ адзін від сыру, аналагаў у Беларусі якому яшчэ няма. Усіх сакрэтаў вытворцы не хочуць раскрываць загадзя, але завод ужо чакае ўсё неабходнае для вытворчасці абсталяванне. На гэты момант прадпрыемства вырабляе больш за 40 відаў сыроў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

■ Справы аграрныя

СТАТАК РОБІЦЬ ДАСТАТАК

Летась прыбытак ад экспарту прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў 2,4 млрд долараў

Апошнім часам у нашай краіне ўздымаліся і актыўна вырашаліся праблемныя пытанні ў аграпрамысловым комплексе. Вынікам гэтай дзейнасці стала прыняцце комплексу ўказаў, якія накіраваны на ўдасканаленне дзяржаўнай аграрнай палітыкі і павышэнне эфектыўнасці работы арганізацый АПК. Аб фарміраванні ўзгодненай аграпрамысловай палітыкі і агульнага рынку сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання з дзяржавамі — партнёрамі Беларусі па Еўразійскім эканамічным саюзе ішла размова з міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанідам ЗАЙЦАМ падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.

Пасяўная без сюрпрызаў

Набліжаецца вясна. Міністр адзначыў, што ў краіне ўсё зроблена, каб годна яе сустрэць. Цяпер у нас хапае ўгнаенняў, а таксама ёсць дастатковая колькасць паліва, каб правесці вясновую пасяўную кампанію. Механізм іх набыцця і закупкі ўжо пазначаны галіновымі дакументамі і пастановамі Савета Міністраў. Загадзя былі прыняты пэўныя нарматыўна-прававыя дакументы, якія забяспечваюць сёлета засваенне і крэдытных рэсурсаў. Паводле слоў міністра, на правядзенне вясенняй сяўбы спатрэбіцца каля 12 трлн рублёў.

Экспарт павялічаць да 7 млрд долараў

Спецыялісты «Рассельгаснагляду» пастаянна наведваюць розныя беларускія мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы і часам выяўляюць пэўныя парушэнні. Так, здараецца, там узнікаюць пытанні, але Леанід Заяц лічыць, што не варта драматызаваць, бо ў Беларусі сітуацыя з вытворчасцю харчовых прадуктаў знаходзіцца пад пастаянным кантролем. За якасць на мясакамбінатах адказваюць тэхнолагі, спецыялісты, кіраўніцтва і г. д. Тыя заўвагі, якія былі выказаны Расіяй і тычацца менавіта санітарыі, па вялікім рахунку, не носяць для нашых прадпрыемстваў пастаянны характар. Так, ёсць на асобных участках дробныя недапрацоўкі, але глабальных парушэнняў не выяўлена. Наш харчовы прадукт па-ранейшаму з'яўляецца бяспечным для ўнутранага спажывання і для пастаўкі на экспарт.

Аднак гэтыя факты дробных недапрацовак абавязваюць кіраўніцтва прадпрыемстваў і спецыялістаў больш шчыльна паглядзець на недахопы, бо ад гэтага залежыць імідж іх прадпрыемства на знешніх рынках, упэўнены міністр. І гэта не проста словы. Цяпер перад галіной пастаўлена няпростая задача — з існуючага на сёння экспарту прадуктаў харчавання ў памеры 5,8 млрд долараў за год выйсці на 7 млрд долараў. Разам з тым прырост існуе, і ёсць усе падставы лічыць, што станоўчая дынаміка па аб'ёмах захаваецца на працягу ўсяго года. Каб упэўнена замацавацца на расійскім рынку і цвёрда стаяць там на нагах і надалей, многія перапрацоўчыя структуры павінны больш настойліва змагацца за якасць сваёй прадукцыі, за высокую санітарыю і г. д.

Расійскі рынак для нас адкрыты

Заяўлялася, што Беларусь і Расія будуць пераглядаць раней узгодненыя прагнозныя балансы па пастаўках харчавання на расійскі рынак. Леанід Заяц адзначыў, што ў сакавіку на беларускай пляцоўцы адбудзецца сумесная калегія з удзелам Мінсельгаса РФ на прадмет паставак нашай прадукцыі на расійскі рынак. Ужо вядома, што сёлета нашы пастаўкі ў гэту краіну павялічацца і па малацэ, і па мясе.

Абмежаванняў у пастаўках у нас няма. Больш за тое, Расія сёння спажывае 800 тысяч тон сыру, прычым 400 тысяч тон яна імпартуе. З гэтага імпарту 120 тысяч тон ідзе з Беларусі. Таму беларускую нішу тут можна нават павялічыць. Неабходна толькі развіваць дадатковыя магутнасці па вытворчасці сыру, у тым ліку за кошт мадэрнізацыі існуючых прадпрыемстваў. Гэты сегмент прадукцыі цяпер павінен стаць прыярытэтным.

Генетычны патэнцыял прадукцыйнасці малочнай жывёлы ў краіне перавышае 10 тысяч кг малака на адну карову за год.

Акрамя таго, наша суседка летась завезла за 11 месяцаў па імпарце каля 560 тысяч тон мяса буйной рагатай жывёлы (БРЖ), з якіх 447 тысяч было пастаўлена з трэціх краін, з Беларусі — 113 тысяч тон. А гэта ўжо 20,3% ад рынку імпарту.

У цэлым патрэба РФ у малочных прадуктах складае каля 38 млн тон. Летась яны атрымалі ўласныя 30,5 млн тон малака, а таксама паменшылі аб'ёмы вытворчасці ялавічыны на 258 тысяч тон. У той жа час нашы аб'ёмы вытворчасці гэтых пазіцый павялічыліся.

А вось па птушцы самазабеспячэнне Расіі сёння дасягае 90%. Таму Леанід Заяц упэўнены, што прыярытэтнымі па экспарце ў Расію для Беларусі з'яўляюцца два сегменты: малако і малочныя прадукты, а таксама мяса буйной рагатай жывёлы. Тут нашай краіне неабходна павысіць прадукцыйнасць дойнага статку і павялічыць колькасць галоў БРЖ. Гэта дасць магчымасць сёння вырабляць каля 1 млн тон мяса ялавічыны, і на 10 млн тон да 2020 года мы павінны выйсці па аб'ёмах вытворчасці малака, лічыць міністр. Пры гэтым краіне ў бліжэйшыя 5 гадоў трэба стварацца экспартны патэнцыял у аб'ёме прыкладна 5–5,5 млн тон малака і выйсці на 400–500 тысяч тон мяса, якое будзе пастаўляцца на расійскі рынак. Выкананне такіх амбіцыёзных задач дазволіць галіне атрымаць у 2020 годзе каля 8–8,5 млрд долараў па экспарце ад прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Аднак мець сёлета агульны аб'ём экспарту з Расіяй у памеры 7 млрд долараў не з'яўляецца канчатковай мэтай для АПК Беларусі. Пры гэтым неабходна забяспечыць станоўчае сальда, а не проста гандляваць. За мінулы год гэтае сальда ў нас склала плюс 2,4 млрд долараў. Міністр адзначыў, што і сёлета даход ад такога гандлю не павінен быць ніжэйшым.

Збожжа — каля 10 млн тон

Мінулы год стаў даволі няпростым для айчыннай эканомікі з улікам сітуацыі на рынках краін — асноўных партнёраў Беларусі, а таксама шэрагу ўнутраных фактараў. Міністр адзначыў, што для аграпрамысловага комплексу краіны ён быў складаным, але досыць выніковым. У цэлым захавана станоўчая дынаміка развіцця. Тэмп росту сельскагаспадарчай вытворчасці ва ўсіх катэгорыях гаспадарак склаў 103,1%.

Спрыяльным год стаў для раслінаводства. Атрыманы значны ўраджай збожжавых і зернебабовых культур — 9,7 млн тон. На 463 тысячы тон больш атрымана цукровых буракоў, на 4 тысячы тон — ільновалакна, на 54 тысячы тон — рапсу, бульбы і гародніны — на 370 і 49 тысяч тон адпаведна. Забяспечана станоўчая дынаміка ў вытворчасці малака, яек, мяса птушкі. Практычна цалкам задаволены ўнутраныя патрэбы ў харчовым збожжы і кармах для грамадскай жывёлагадоўлі. У поўным аб'ёме выкананы абавязацельствы па пастаўках збожжа ў лік дзяржаўных патрэб.

Пастаўкі сельскагаспадарчай сыравіны на перапрацоўку дазволілі забяспечыць рост вытворчасці харчовых прадуктаў па выніках года на 1,4%. Так, вытворчасць малочнай прадукцыі ўзрасла на 6,7%, макаронных і кандытарскіх вырабаў — на 13,9%. Разам з тым тэмп росту вытворчасці мясных вырабаў склаў толькі 91% да ўзроўню 2013 года.

Даволі няпростая сітуацыя на рынках краін — асноўных партнёраў Беларусі — негатыўна адбілася на знешнеэканамічнай дзейнасці. Летась арганізацыі сістэмы Мінсельгасхарча на экспарт паставілі тавараў на суму больш як 3 млрд долараў, што на 5% менш узроўню 2013 года. Міністр упэўнены, што зніжэнне экспартных паставак абумоўлена ў першую чаргу падзеннем попыту на знешніх рынках на некаторыя віды малочнай прадукцыі (суцэльнага і абястлушчанага сухога малака), скарачэннем аб'ёмаў паставак у натуральным выражэнні мясной прадукцыі (свініны, ялавічыны), а таксама дэвальвацыяй расійскага рубля ў адносінах да долара.

Мадэрнізаваць «малочку» за 5 гадоў

Калі 10 млн т збожжа айчынны АПК ужо змог атрымаць, то 10 млн т малака пакуль застаюцца запаветнай мэтай. Леанід Заяц упэўнены, што невырашальных задач няма.

Генетычны патэнцыял прадукцыйнасці малочнай жывёлы ў краіне перавышае 10 тысяч кг малака на адну карову за год. Для рэалізацыі гэтага патэнцыялу неабходна стварыць аптымальныя ўмовы ўтрымання і кармлення жывёлы. Мадэрнізацыя малочнатаварных фермаў наблізіла ўмовы ўтрымання кароў на гэтых фермах да аптымальных, але праблема забеспячэння паўнавартаснага кармлення яшчэ вырашана не ўсюды.

Ужо вядома, што сёлета нашы пастаўкі ў Расію павялічацца і па малацэ, і па мясе.

За бліжэйшыя 5 гадоў плануецца завяршыць комплекснае аснашчэнне сучаснымі тэхналогіямі і абсталяваннем усіх малочнатаварных фермаў з адначасовым стварэннем кармавой базы, якая адпавядае патрэбам малочнай галіны. Паўнавартаснае кармленне жывёл дасць магчымасць палепшыць асноўныя параметры па аднаўленні статка і забяспечыць яго павелічэнне толькі высокапрадукцыйнымі каровамі. Выкананне гэтых тэхналагічных нормаў пры вытворчасці малака на ўсіх этапах, ад нарыхтоўкі кармоў, гадоўлі рамонтнага маладняку — да арганізацыі кармлення і даення кароў, стане залогам высокай прадукцыйнасці дойнага статку і павелічэння аб'ёмаў вытворчасці малака, лічыць міністр.

Выкананне гэтых задач дазволіць галіне ў 2020 годзе атрымліваць каля 9 млн тон малака, што на 44% перавышае ўзровень яго вытворчасці летась. Пастаўкі малака і малакапрадуктаў на ўнутраны рынак павінны скласці каля 3,7 млн тон, пры гэтым будзе створаны экспартны патэнцыял у аб'ёме 5,3 млн тон, удакладніў планы міністэрства Леанід Заяц.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Тэндэнцыя

БІЗНЕС ДЛЯ ГРАМАДСТВА

Узровень карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці неабходна павышаць. Да такога меркавання прыйшлі падчас «круглага стала» прадстаўнікі беларускай бізнес-супольнасці. Таксама прадпрымальнікі вялі размову аб неабходнасці фарміравання нацыянальнай мадэлі сацыяльнай адказнасці.

Высокі ўзровень карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці (КСА) бізнесу з'яўляецца важным фактарам, які ўплывае на дабрабыт і ўстойлівае развіццё большасці краін. У Беларусі інстытут КСА знаходзіцца на стадыі станаўлення. Кіраўнікі беларускіх кампаній і дзяржаўныя органы сумесна займаюцца пошукам шляхоў яе рэалізацыі.

«У нас ёсць сацыяльныя ролі. Аднак не ўсе іх разумеюць. Бюджэт Мінска сёння на 80% фарміруецца з падаткаў, якія плацяць недзяржаўныя прадпрыемствы, бюджэт краіны — на 50%. Цяпер ужо створана 356 тысяч прыватных прадпрыемстваў. Каб дасягнуць насычанасці рынкаў еўрапейскага ўзроўню неабходна каля 800 тысяч. Сёння бізнес засяроджаны на праблемах эканомікі, таму сацыяльныя пытанні не заўсёды ляжаць на паверхні», — адзначыў **Уладзімір КАРАГІН, старшыня «Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў».**

КСА прынята лічыць добраахвотным укладам бізнесу ў развіццё грамадства, у эканамічную, экалагічную і сацыяльную сферы. Разуменне сацыяльнай адказнасці з'яўляецца перадумовай для павышэння нацыянальнага іміджу дзяржавы і канкурэнтаздольнасці эканомікі, росту інвестыцыйнай прывабнасці, зніжэння сацыяльных рызык і прадухілення карупцыі. Урады многіх краін надаюць вялікае значэнне прасоўванню КСА на нацыянальным узроўні. Напрыклад, у краінах Еўрасаюза паспяхова ўжываюць гэтую стратэгію пры вырашэнні прыярытэтных задач сацыяльна-эканамічнага развіцця праз распрацоўку Нацыянальнага парадку па карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці. Яна выяўляецца ў праграмах па захаванні балансу працы і адпачынку супрацоўнікаў, стварэнні роўных магчымасцяў для кар'ернага росту. Таксама на прадпрыемствах урада ляжыць фарміраванне дзяржбюджэту з улікам КСА. Беларуская канцэпцыя карпаратыўнай адказнасці атрымала сваё развіццё ў 2006 годзе дзякуючы ініцыятыве ААН «Глабальная дамова». Дакумент заклікае дзелавыя колы кіравацца ў сваёй дзейнасці асноватворнымі прынцыпамі правоў чалавека і працоўных адносінаў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

■ Ад першай асобы

ТАМ, ДЗЕ ХАРАСТВО НЕ СХАВАНА АД ВАЧЭЙ...



Убачыўшы фотавыявы прыроды, зробленыя Уладзімірам Ждановічам, напачатку можна падумаць, што гэта Афрыка, а не Беларусь. Усё вельмі экзатычна, ярка, светла. Але ж не — краявіды гэтыя насамрэч нам родныя. Пра што з задавальненнем распавяла дачка фатографа Валерыя ЖДАНОВІЧ:

«Я памятаю, як у самае першае маё падарожжа па Прыпяці мы прыляцелі з Мінска ў Мазыр на «кукурузніку». Там пераселі на цеплаход. Побач з намі праплывалі высокія берагі, ляталі ластаўкі. Мне здавалася, што я ў нейкай Бразіліі — трапіла ў рай. Па дошчачцы мы сышлі на бераг, і я зразумела, што гэты рай насамрэч... камарыны *(усміхаецца)*. І пакуль нам не прывезлі сродкі абароны ад насякомых, я ўвогуле не разумела, як выжываюць там людзі...



Пазней мы ўжо абжыліся. Збілі з дошак стол і назвалі яго «рэстаран «Паддубны».

Навакольную прыгажосць я магла ацаніць спаўна. Бо калі ты жывеш у намёце, цябе нішто не аддзяляе ад прыроды. Можна кожны дзень купацца, колькі хочаш, лавіць рыбу. І ўсе, хто там жыве, знаходзяцца побач з табой. Бабры, даючы нырца, увесь час лупілі хвастом. Ласіха з ласянём пераплывалі рэчку. Для гарадскога дзіцяці, якое ўпершыню трапіла ў вёску, гэта было ўражанне мацнейшае, чым ад National Geografic сёння па тэлевізары.

А пасля здарыўся Чарнобыль. Гэта было страшна, ніхто не быў да гэтага падрыхтаваны. Аднак насуперак катастрофе тата разам з Вадзімам Клакоцкім паехалі і зрабілі кніжку пад назвай «Пяро арлана». Выданне было папулярным у свой час і разышлося досыць хутка.

У заказніку ракі Лань (там, дзе яна ўпадае ў Прыпяць) яны прабылі доўгі час, пільнуючы калонію чапель. Бацька сядзеў на дрэве і здымаў чаплінае жыццё, сачыў, як яны кормяць сваіх птушанят, назіраў за іх раскладам жыцця. Аднойчы ўбачыў шэршня, які вылецеў з дупла. Не падумаўшы, папшыкаў туды дыхлафосам... Давялося ратавацца, кінуўшы нават камеру. Бо тры ўкусы шэршня могуць быць смяротнымі для чалавека.

Чаплі звычайна селяцца ў такіх мясцінах, дзе людзям не вельмі камфортна. Навокал было балота, усё стаяла ў вадзе. Таму і ім даводзілася, нібы тым чаплям, хадзіць у батфортах.

Забіраліся ў зусім непралазныя месцы. Тагачасны дырэктар Прыпяцкага запаведніка атрымаў БТРы — тэхніку, на якой можна ездзіць па балотах. На гэтых БТРах напарнікі ехалі ў самы гушчар, каб зняць якую-небудзь кветачку — гарлачык ці беларускую архідэю, якая расце ў адным ці двух месцах на ўсю краіну. Былі дэльтапланы, каб весці ў запаведніку ўлік з паветра, — з іх таксама рабіліся фотаздымкі вельмі прыгожых агульных планаў. Гэтыя выявы нечым падобныя да тых, што сёння змешчаны на білбордах «Я люблю Беларусь».

Увогуле бацьку вельмі падабалася «падглядаць» птушынае жыццё. Аднак да птушкі вельмі цяжка наблізіцца так, каб яна цябе не заўважыла. Даводзілася маскіравацца, будаваць схованкі, шалашыкі. Здымаць прыроду, я лічу, — гэта найвышэйшы пілатаж фатографа. Цяпер з дапамогай «Фоташопа» і розных ідэй можна зрабіць вельмі прыгожыя рэчы. Але калі не выкарыстоўваць сучасныя навінкі, трэба проста неверагодная цярплівасць і глыбокае разуменне таго прадмета, які ты здымаеш.

Пазней з'явілася ідэя зрабіць кніжку пра Прыпяцкі запаведнік. Бацька здымаў усе віды, што тады былі занесены ў Чырвоную кнігу. Яму заставалася ўжо зусім няшмат, але апошні сезон так і застаўся няскончаным, тэкст ненапісаным, а кніжка незавершанай...

Прыроду ён любіў яшчэ з маладых гадоў. Хоць і нарадзіўся ў Мінску, вырас у Дзяржынску: там яго сям'я мела свой дом, сад, побач рос лес. Бабуля паўсюль з сабой брала ўнука, таму ён умеў рабіць любую вясковую працу.

З іншага боку, жывучы ў горадзе, тата не набываў сабе лецішча, не будаваў дом у вёсцы, бо не хацеў прывязвацца да пэўнага месца, быць абавязаным там рабіць нешта. Яму было больш даспадобы вандраваць паўсюль, здымаць тое, што бачыў. Ён лічыў, што свабода ў гэтым плане для яго мае большую вартасць.

Аднак у канцы жыцця разам з Рыгорам Барадуліным ён стварыў кніжку «Вяртанне». Ілюстрацыі для яе рабіліся ў хаце, дзе жыла маці Барадуліна. Паэт жыў там і пасля яе смерці, і мы там часам жылі. Бацька адчуваў настальгію па хаце, садзе, печцы.

У «Маладосці» ў свой час выйшла кніжка «Усе мы з хат». Гэта тэма была асноўнай для пакалення майго бацькі, бо ім давялося жыць у тую пераломную эпоху, калі адбываўся пераход ад вясковага жыцця да гарадскога, для мноства людзей. Бо даваенны Мінск у 350 тысяч людзей і цяперашні больш чым 2-мільённы горад — таксама непараўнальныя велічыні і рэчы».

Завяршыўшы нашу размову, я думала пра тое, ці можа гараджанін так любіць прыроду, як любіць яе чалавек з вёскі. Той, хто босым бегаў па прасторах духмяных палёў, каму дахам над галавою служыла бяздоннае сіняе неба, а касматыя аблокі былі заўсёднымі спадарожнікамі. Мне падумалася, што сэрца беларускай прыгажосці схаванае дзесьці ў вёсках. І шмат страчвае той, хто ўсе летнія адпачынкі праводзіць ля далёкіх мораў, а ў тлуме штодзённых спраў так і не знаходзіць часу, каб спазнаць прыхаванае харство роднай зямлі...

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота з асабістага архіва сям'і Ждановічаў.

■ Кадры старой кінахронікі

Аддаць жыццё за лепшага сябра

На гарадскім тэлерадыёвяшчальным канале «Гродна+» задуманы цэлы цыкл тэлепередач пад назвай «Гісторыі Віктара Саяпіна». Віктар Саяпін — краязнавец, які ўсё сваё жыццё вывучаў паслявaеннае Гродна. Ужо знятыя чатыры тэлефільмы з гэтай серыі: «Баторыеўка і яе насельнікі», «Палац Радзівілаў у Гродне», «Фара Вітаўта. Галоўны храм Гродна», «Гродзенскі тэатр лялек».

Нядаўна ў абласной бібліятэцы імя Яўхіма Карскага адбыўся прэм'ерны паказ пятага дакументальнага фільма — «Заапарк Яна Каханоўскага». Аўтар расказаў пра ідэю стварэння фільма пра першы ў Беларусі заапарк. У фільм увайшлі дакументальныя кіназдымкі 40-60-х гг. XX стагоддзя з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў, аўтарскія кінавідэаздымкі 70-90-х гг. з асабістага архіва В.Саяпіна і іншых гродзенскіх калекцыянераў (Ф.Варашыльскага, А.Госцева, А.Яршова, А.Сявенкі, А.Семенчука, К.Федаровіча).

Кадры старой кінахронікі вярнулі многіх гасцей бібліятэкі ў мінулае, калі яны яшчэ былі дзецьмі, хадзілі на экскурсіі з настаўнікамі біялогіі ў заапарк, а разам з бацькамі — па нядзелях. Рэдкія чорна-белыя фотаздымкі прадэманстравалі прысутным настальгічнае вяртанне ў 60-70-я гады мінулага стагоддзя.

Галоўным героем фільма стаў заснавальнік заапарка Ян Каханоўскі. Цікавы лёс гэтага чалавека, які нарадзіўся ў Гродне ў 1894 годзе. Скончыў Гродзенскую гімназію, атрымаў вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «інжынер-аграном». Выкладаў прыродазнаўства ў мужчынскай гімназіі імя Адама Міцкевіча. З'яўляўся членам камітэта Таварыства аматараў прыроды і савета Гродзенскага гарадскога музея прыроды, кіраўніком біялагічнага саду, загадчыкам кабінета прыроды гродзенскай мужчынскай гімназіі. Падчас вайны адмовіўся ад эвакуацыі і застаўся ў горадзе.

У 1942 годзе, за забойства мясцовымі патрыётамі нямецкага лекара, Каханоўскі быў арыштаваны і ў якасці закладніка разам з іншымі прадстаўнікамі мясцовай інтэлігенцыі пасаджаны ў турму. Калі грамадскасць горада звярнулася да акупацыйных улад з просьбай аб вызваленні закладнікаў, улады пагадзіліся расстраляць не 100, а 25 чалавек. У лік ахвяр трапіў сябар Каханоўскага — настаўнік Ю. Вэвюрскі, бацька шасцярых дзяцей. Астатнія закладнікі, у тым ліку і Ян Каханоўскі, атрымалі магчымасць выйсці на свабоду.

У яго не было сваёй сям'і. Усё яго жыццё запаўнялі любімая праца і грамадская дзейнасць. Каханоўскі звярнуўся да нямецкага афіцэра з просьбай уключыць яго ў лік асуджаных да расстрэлу замест Вэвюрскага. Гэта быў яго ўласны выбар, так ён прынёс сваё жыццё ў ахвяру. Восенню 1942 года Ян Каханоўскі быў расстраляны.

Ірына ШАТЫРОНАК

Ігуменскі тракт
№ 6 (107)

Павел ЛАТУШКА:

«ЧАС ЗБІРАЦЬ КАМЯНІ»

Спадчына Адама Міцкевіча вяртаецца на Радзіму

Творчая спадчына Адама Міцкевіча з кожным днём робіцца для нас усё больш блізкай. Днямі музейная калекцыя «Дома Ваньковічаў» папоўнілася копіяй партрэта Марыі Шыманоўскай — знакамітага парыжскага дзеяча, да таго ж цешчы паэта. Карціну з арыгінала Валенція Ваньковіча напісаў мастак Віктар Альшэўскі. Акрамя жывапіснага палатна, у музеі цяпер можна ўбачыць і выставу з 23 прадметаў, сфарміраваную з калекцый музея Адама Міцкевіча ў Парыжы і Польскага гістарычнага і літаратурнага таварыства ў Парыжы. Сярод экспанатаў — памятныя медалі, арыгінальныя гравюры да некаторых вядомых твораў паэта, а таксама кніга «Славяне», у якую ўвайшлі лекцыі, прачытаныя Міцкевічам у Каледж дэ Франс. Пра тое, як спадчына Міцкевіча вяртаецца на Радзіму, карэспандэнту «Звязды» расказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Францыі Павел ЛАТУШКА, які асабіста прысутнічаў на адкрыцці выставы ў Мінску.

— Павел Паўлавіч, як з'явілася ідэя такой калекцыі?

— Ідэя ўзнікла яшчэ тады, калі я працаваў міністрам культуры і мы абмяркоўвалі тэму вяртання гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусь. Для гэтага існуе некалькі шляхоў. Першы — гэта міждзяржаўныя дамоўленасці. На жаль, ён фактычна не рэалізуецца, бо ніводная краіна не хоча аддаваць тое, што належыць яе музеям і знаходзіцца ў дзяржаўных калекцыях. Другі шлях — гэта выставы, экспанаванне ў сябе твораў з замежных калекцый. Трэці — набыццё культурных каштоўнасцяў і вяртанне іх у Беларусь (апошнім часам ёсць добрыя прыклады такой працы). Чацвёрты шлях — гэта стварэнне копій. Такі падыход можна па-рознаму ацэньваць, але ён дае рэальную магчымасць вяртання гісторыка-культурных каштоўнасцяў у Беларусь. Я прачытаў кнігу Уладзіміра Шчаснага (былога старшыні камісіі па справах ЮНЕСКА), у якой ён узгадаў, што партрэт Адама Міцкевіча, выкананы Валенціем Ваньковічам, знаходзіцца ў храме XII стагоддзя Сэн-Сэвэрэн — адным з самых старых каталіцкіх храмаў Парыжа. Я наведаў гэты касцёл, пазней сустрэўся з архіепіскапам Парыжа і настаяцелем Сэн-Сэвэрэн і мы пачалі працаваць над тым, каб рэалізаваць праект копіі твора. На жаль, праца пакуль не скончана. Але ў гэты ж час высветлілася, што ў музеі Адама Міцкевіча ў Парыжы знаходзіцца яшчэ адзін твор Ваньковіча — партрэт Марыі Шыманоўскай. Калі я прачытаў пра гэту асобу (яе выключнасць, унікальнасць як музыканта і чалавека), якая аб'ядноўвала выдатных культурных дзеячаў Еўропы таго часу, да таго ж была цешчай Адама Міцкевіча, я вырашыў, што стварэнне копіі гэтага партрэта стане першым крокам у вяртанні спадчыны пісьменніка ў Беларусь.

— Якой будзе далейшая праграма вяртання?

— Мы цяпер працуем над тым, каб зрабіць копію карціны Валенція Ваньковіча «Апафеоз Напалеона», якая знаходзіцца ў музеі Міцкевіча ў Варшаве. Мастак Віктар Альшэўскі ўжо наведаў яго, і мы атрымалі папярэднюю дамоўленасць аб супрацоўніцтве. Спадзяёмся, што адна з беларускіх кампаній прафінансуе гэту працу, і такім чынам яшчэ адзін твор славутага мастака вернецца ў Беларусь. Вельмі важна, што падобныя праекты падкрэсліваюць інтэграванасць беларускай культуры ў еўрапейскую творчую прастору. Партрэт Марыі Шыманоўскай, выкананы Валенціем Ваньковічам, яскрава ілюструе, што наша культура звязана з Усходам і Захадам. Гэта сведчыць і пра тое, што нам ёсць чым ганарыцца, ёсць што паказаць і расказаць пра сябе іншым. І такіх прыкладаў сотні, тысячы — мы проста павінны працаваць, каб паказваць іх.

— На старонках нашай газеты і на сайце «Звязды» вельмі актыўна абмяркоўвалася асоба Адама Міцкевіча. А што вы скажаце пра гэтага паэта і яго ролю ў айчыннай і замежнай культуры?

— Калісьці я працаваў у Варшаве і тагачаснаму мэру Леху Качынскаму (пазней ён стаў прэзідэнтам Польшчы) прапанаваў усталяваць помнікі Якубу Коласу і Янку Купалу ў Варшаве. У якасці прыкладу я прывёў яму інфармацыю пра тое, што мы адкрылі помнікі Адаму Міцкевічу ў Мінску. Аднак ён напісаў мне ў адказ, што Міцкевіч належыць беларусам, палякам, літоўцам — належыць свету. І такіх постацяў, якія нарадзіліся на беларускай зямлі, а пасля сталі сусветна вядомымі, у нас шмат. Ці мы, беларусы, павінны адмаўляцца ад іх?.. Калісьці якраз на старонках «Звязды» вялася дыскусія пра Лявона Бакста — чалавека, што нарадзіўся ў Гродне, з'яўляўся яўрэем па нацыянальнасці, працаваў з рускім балетам, які паказвалі ў еўрапейскіх сталіцах, у тым ліку ў Парыжы. Ці належыць ён беларускай культуры? Безумоўна, так. Чаму мы павінны адмаўляцца ад такіх людзей і такіх постацяў? Час збіраць камяні. І нават не абавязкова казаць, што хтосьці выключна наш і з'яўляецца толькі беларусам. Наадварот, праз тое, што Міцкевіч належыць розным народам, мы паказваем багацце беларускай культуры, яе ўнікальнасць. І ўнікальнасцю гэтай варта ганарыцца і адкрываць яе для іншых.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Партрэт Адама Міцкевіча, зроблены Валенціем Ваньковічам.

ПА СЛЯДАХ ГАННЫ ЦЮНДЗЯВІЦКАЙ

Калі выдавецтва «Полымя» ў 1993 годзе ўпершыню выдала кнігу «Літоўская гаспадыня» ў перакладзе на беларускую, велізарным накладам, гэта была вялікая сенсацыя. Кніга выклікала тады гарачыя спрэчкі: ці мае кніга з такой назвай дачыненне да нашай гісторыі і культуры? Асоба самой аўтаркі, Ганны Цюндзявіцкай, у параўнанні са зместам гэтай славутай гаспадарчай энцыклапедыі XIX стагоддзя, заставалася ў цені. Ды і сам змест, у практычным яго аспекце, тады цікавіў чытачоў менш, чым прэцэдэнт, чым сімвалічная дэкларацыя: вось, шляхецкая гаспадарчая кніга, няруская, але ж наша!

Змянілася цэлае пакаленне, перш чым беларусы сапраўды асвойталіся з «Літоўскай гаспадыняй»: некаторыя рэцэпты з кнігі вярнуліся ў практычны ўжытак, а па мясцінах, непасрэдна звязаных з жыццём Ганны Цюндзявіцкай, цяпер ужо праходзяць экскурсіі з дэгустацыямі і майстар-класамі. Першая такая вандроўка адбудзецца 22 лютага, акурат на апошні дзень Масленіцы. І, як высвятляецца, усе найбольш важныя для жыцця нашай гераіні кропкі на мапе знаходзяцца зусім побач з Мінскам. Так што дакрануцца да тых бярвенняў і камянёў, да якіх дакраналася «літоўская гаспадыня», цяпер можна ўласнымі рукамі. А гэта — важкі аргумент у спрэчцы, ці нашая гэта спадчына.

Наша будучая гераіня, Ганна Прушынская, нарадзілася 18 ліпеня 1803 года ў Каралішчавічах на Свіслачы, усяго за некалькі кіламетраў ад сучаснай гарадской мяжы Мінска, у сям'і падкаморыя мінскага Міхала Прушынскага (герба Агоньчык) і Тэклі з Валянскіх. Ахрышчана была ў мясцовым драўляным касцёле Апекі Маці Божай, які нейкім цудам дажыў да нашых дзён, хаця і ў выглядзе калгаснага клуба (сёння ўжо зачыненага).

З гэтым жа сціплым будынкам звязана яшчэ некалькі годных імёнаў: у 1861 годзе яго наведаў славуты кампазітар Станіслаў Манюшка, які склаў апісанне мясцовага аргана; у 1873 годзе тут узяў шлюб са сваёй 18-гадовай кузінай Марыяй Прушынскай славуты польскі і рускі мастак Генрых Семірадскі, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў позняга акадэмізму. А ў 1885 годзе тут развіталіся і пахавалі на мясцовым цвінтары Яна Эдварда Ваньковіча, энтамолага з еўрапейскай вядомасцю.

Атрымаўшы хатнюю адукацыю і правучыўшыся некалькі гадоў у віленскім пансіёне Дэйбеляў для дзяўчат-шляхцянак, 19 лістапада 1826 года Ганна Прушынская выйшла замуж за Юзафа Цюндзявіцкага, былога маршалка шляхты Барысаўскага павета. Гэта адбылося ў заслаўскім касцёле ў гонар Найсвяцейшай Панны Марыі, які зведаў пазней не менш пакручасты лёс, чым касцёл у Каралішчавічах. Але таксама, з Божае ласкі, дажыў да нашых дзён і нават выдатна рэстаўраваны. Шкада, што не дажыла да нашых дзён сядзіба ў Кішчынай Слабадзе сучаснага Барысаўскага раёна, дзе Цюндзявіцкія пасяліліся пасля шлюбу і вялі ціхае сямейнае і гаспадарчае жыццё. Пра яго дэталі мы ведаем мала, можам толькі ўявіць, ведаючы ў агульных рысах, як жылі іншыя шляхецкія сем'і сярэдняй заможнасці. Гадавы абарот сезонаў з іх клопатамі; амаль натуральная, хоць і вельмі разнастайная, гаспадарка, нарыхтоўка запасаў, а таксама дзеці, хваробы, прыгонныя сяляне, касцёл — усе абавязкі маці і жонкі Ганна выконвала ўзорна. І нават паспявала асэнсоўваць іх, заўважаць і занатоўваць заканамернасці, адбіраць лепшыя спосабы, як забяспечваць сям'ю і прыслугу ўсім неабходным, сачыць за здароўем усіх, падтрымліваць жаноцкую прывабнасць. З яе шасцярых дзяцей — 2 хлопчыкаў і 4 дзяўчынак — ніхто не памёр у дзяцінстве (што было нормай тых часоў), усе дажылі да шлюбу.

У выніку шматгадовай працы і ўважлівых назіранняў хатняй гаспадыні і з'явілася «Літоўская гаспадыня», якая выйшла ў свет у 1848 годзе ў выдавецтве Завадскіх у Вільні. Наклад першага выдання быў раскуплены вельмі хутка, і ў выніку спатрэбіліся яшчэ 5 выданняў кнігі на польскай мове і адно — на рускай. Згодна з воляй аўткі, праз яе прыродную сціпласць, усе выданні пабачылі свет ананімна. Так што нават сёння шмат хто з гісторыкаў і культуролагаў не ведае сапраўднага імя аўткі бестселера XIX стагоддзя. А неўзабаве, на 47-м годзе жыцця, Ганна Цюндзявіцкая памерла (18 красавіка 1850 года). Не пакінуўшы па сабе гучнай славы і нават партрэта або фотаздымка (прынамсі, да нас яны не дайшлі) — толькі дзяцей, добрае імя, вядомае ў вузкім коле, і кнігу. Нават не адну: пасля яе застаўся таксама рукапіс «Гаспадарчага штогодніка», які падрабязна распісваў гаспадарам і гаспадыням усё, што яны павінны рабіць на працягу года: у хаце, на полі, у аборы, садзе, на лугах, у пчальніках. Кніга выйшла пасмяротна ў 1854 і 1861 гадах. І, як пісаў біёграф пані Ганны Аляксандр Ельскі, «трэцяя, вельмі важная праца Цюндзявіцкай, якая засталася ў рукапісах, належным чынам не ўпарадкаваных, уяўляе сабой лекарскі даведнік для жанчын, прызначаны для дапамогі вясковаму люду ў лячэнні хвароб». На жаль, гэты рукапіс сям'я выдаць з нейкіх прычын не здолела, і ён, хутчэй за ўсё, загінуў, як і большасць панскіх папер у нашым краі.

Рэдагавала «Літоўскую гаспадыню» жонка выдаўца Завадскага Вінцэнціна, і гэтая праца наштурхнула яе на думку напісаць уласную кнігу, ужо чыста кулінарную. А апошняе выданне, 1873 года, правы на якое ўжо выкупіла выдавецтва, Вінцэнціна Завадская таксама істотна дапрацавала і дапоўніла. А яшчэ праз нейкі час кніга страціла актуальнасць: новыя, значна больш жорсткія, рынкавыя ўмовы зрабілі той лад жыцця, які паўстае са старонак «Літоўскай гаспадыні», немагчымым. Кошт найму рабочых рук болей не дазваляў рабіць дома ўсё — ад свечак і канфітураў да фарбаў і кажухоў, канкуруючы з прамысловымі прадпрыемствамі. Канчатковую рысу пад старым ладам жыцця і нават пад самім геаграфічным паняццем «Літва» ў дачыненні да Мінска, Заслаўя, Барысава і ўсёй сучаснай цэнтральнай Беларусі падвёў сусветны аграрны крызіс пачатку 1880-х гадоў.

Аднак сёння многія людзі ўжо стаміліся ад масавай вытворчасці і масавай культуры. І менавіта гэта забяспечвае «Літоўскай гаспадыні» і апісанаму ёй ладу жыцця другое жыццё. Такое жыццё, натуральна, сёння немагчыма весці штодня, але яго магчыма часткова рэканструяваць, уявіць. Уласна, такой мэце і прысвечана экскурсія па мясцінах Ганны Цюндзявіцкай, на якую яшчэ можна запісацца. І прытым пакаштаваць свойскі бездражджавы хлеб, пернікі і своеасаблівы «яблычны сыр», папулярны некалі ласунак. Усё — паводле рэцэптаў «Літоўскай гаспадыні». Далібог, гэта сапраўдны прывілей — падарожжа ў мінулае, на 170 і болей гадоў. І выдатны спосаб адсвяткаваць Масленіцу.

Яблычны сыр ад Ганны Цюндзявіцкай

у адаптацыі штукарскай пекарні і цукерні Žorny

Спосаб прыгатавання: Кіслыя яблыкі, без лупіны і асяродка, разразаюць на чатыры часткі, кладуць у новы гаршчок і наліваюць столькі вады, каб яна пакрыла плады. Потым накрываюць пасудзіну цестам ці мокрым кавалкам палатна і ставяць у печ.

Калі яблыкі адразу добра не спякуцца, ставяць у печ яшчэ раз. Пасля вымаюць, праціраюць праз густое сіта, дадаюць падрумянены мёд (мёду і яблычнай масы бяруць аднолькавую колькасць) і гатуюць да належнай гушчыні, часта памешваючы, каб маса не прыгарэла. Вараць, увесь час мяшаючы, пакуль маса не будзе адставаць ад лыжкі.

Перш чым зняць з агню, насыпаюць трохі апельсінавых лупін, што перад гэтым варыліся ў вадзе да мяккага стану, а таксама імбір, гваздзіку і духмяны перац. Потым выкладваюць масу ў папярэдне намочаную ў вадзе і адціснутую сурвэтку, перавязваюць яе і змяшчаюць пад прэс. Выняты з-пад яго сыр захоўваюць у шчыльна накрытай фаянсавай ці глінянай пасудзіне.

АДСЛУЖЫ, ЯК ТРЭБА, І ЖАНІСЯ!

Як некалі праводзілі ў войска і ладзілі вяселлі

Пасля выхаду аднаго з матэрыялаў рубрыкі патэлефанаваў Георгій Васільевіч Марчук. Апроч прыемных слоў пра мае асабістыя згадкі пра мінулае (успрымаю іх выключна як аванс), прапанаваў некалькі тэм. Ён, напрыклад, параіў прыгадаць, як раней святкавалі вяселлі, адзначалі провады ў армію хлопцаў у вёсцы. А што, сапраўды былі пэўныя традыцыі, якія займалі немалаважнае месца ў жыцці людзей. Калі дадаць да іх яшчэ нараджэнне дзяцей і пахаванні, атрымаецца лаканічны цыкл: нарадзіўся, адслужыў, ажаніўся, пахрысціў і пажаніў нашчадкаў, выйшаў на заслужаны адпачынак, атрымаў вечны спакой. Але не будзем пра сумнае, хаця і падчас вяселляў і провадаў у войска рознае здаралася, часам не зусім смешнае...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЯШЧЭ заспеў час, калі вяселлі святкавалі тры дні запар. Потым неяк неўпрыкмет перайшлі на два, а зараз многія адзначаюць гэтую важную ў жыцці падзею цягам аднаго, на другі дзень запрашаюць хіба толькі родных. Раней месцам правядзення вяселля ў сельскай мясцовасці былі выключна дамы або жаніха, або нявесты (або абаіх па чарзе). Гэта ўжо пасля з'явілася мода гуляць урачыстасці ў кавярні. Запрашаўся не адзін дзясятак чалавек (абы каго з далёкіх сваякоў не пакрыўдзіць, нават калі ты іх даўно не бачыў і не вельмі памятаеш) — родныя, калегі па працы і суседзі. Увечары прыезджых размеркавалі на начлег: хто колькі мог. Каб рассадзіць усіх гасцей, па суседзях збіраліся сталы і лаўкі (табурэтак і крэслаў не хапала). Або іх за некалькі дзён да вяселля пачыналі майстраваць спецыяльна. Вядома, пазычалі і посуд. Яшчэ адна дэталь, пра якую, напэўна, зараз не ўсе ведаюць. У большай палове хаты была сцяна з дошак, якая падзяляла гэтую частку жытла на залу і спальню ці спальні. Асаблівасцю сцяны было тое, што яна была не суцэльнай — не да самай столі і мацавалася да яе толькі па краях. Калі было трэба, гэтыя дошчачкі адбівалі, даставалі цвікі з плінтусаў і сценку пераносілі, павялічваючы карысную прастору хаты. Карацей кажучы, за некалькі дзён да вяселля ўсе тыя, хто меў дачыненне да яго падрыхтоўкі, прыходзілі ў броўнаўскі рух. Закупляліся прадукты (спіртным, гэтай «вадкай валютай», як правіла, запасаліся загадзя), замаўлялі каравай, жанчыны дзялілі паміж сабой, хто што будзе гатаваць на святочны стол ці ў каго якія стравы будуць захоўвацца. Так, памятаю неяк летам у наш склеп папрасілі на час апусціць вялікія ночвы са свежай рыбай. А потым, калі вяселле пела і скакала, на яе забыліся...

ПАДРЫХТОЎКА да вяселля каштавала нямала. Але нельга было быць «горшымі за іншых». Таму з малых гадоў мы чулі размовы дарослых пра будучы «пасаг». На дзяцей часта адкрывалі рахунак у ашчадбанку, куды штомесяц клалі штосьці з зарплаты, спецыяльна з разлікам правесці за сабраныя сродкі вяселле. Напрыклад, тысяча тагачасных савецкіх рублёў былі вялікай сумай. Але і госці, вядома, ішлі віншаваць маладых не з пустымі рукамі. Не памятаю, колькі дарылі дарослыя, сямейныя госці, але для маладых і нежанатых 10 рублёў у якасці падарунка лічылася нармальнай сумай. Было нават такое паняцце, як «вярнуць» кошт вяселля. Падлічыўшы колькасць запрошаных і іх «статус», можна было з вялікай доляй верагоднасці даведацца пра «дэбет з крэдытам». Гэта калі ўсё госці сумленна клалі ў канверты для маладых купюры... Кажуць, бывалі розныя выпадкі. Сабраныя на вяселлі грошы або зноў клалі на ашчадную кніжку да найбліжэйшай вялікай патрэбы ў іх, або набывалася нешта з таго немудрагелістага па сённяшнім часе, што тады трэба было «дастаць», — дыван, тэлевізар. Або мару ўсіх савецкіх людзей — спальны гарнітур ці «сценку».

БЫЛІ на вяселлях і тыя, хто хацеў пагуляць не тое, каб бясплатна, але часам і беспадстаўна для таго. Калі збіралася шмат незнаёмых паміж сабой людзей, які-небудзь мясцовы нахабны маладзён, якога менавіта па гэтай прычыне і не запрашалі, мог хуценька «праскочыць» за стол. Праз нейкі час такога хітруна заўважалі і «прасілі на выхад», але кульнуць некалькі чарак і закусіць той, як правіла, паспяваў. Была яшчэ адна своеасаблівая традыцыя, што часам магла перарасці нават у бойку. Пасля некалькіх «заходаў» — выпілі, паелі, патанцавалі — маладыя, іх бацькі або сваты выносілі на вуліцу невялікі пачастунак: некалькі пляшак віна і гарэлкі, кілішкі, талеркі з закускамі. Каля дома бліжэй да вечара (ці асабліва пасля заканчэння танцаў на мясцовай пляцоўцы — на вяселлі ж іграла музыка, моладзі хацелася працягу) пачыналі збірацца колішнія аднакласнікі маладых, даўнія прыяцелі, выпадковыя знаёмыя і зусім незнаёмыя хлопцы і дзяўчаты. Карацей, тыя, каго не запрашалі на вяселле. Ім налівалі па чарцы, прапаноўваючы выпіць за здароўе маладых. Некаторым хапала гэтага пачастунку, іншыя пачыналі патрабаваць яшчэ... Але з якой нагоды гасцінныя гаспадары павінны былі карміць і паіць чужых людзей? Таму і маладога, і сведку, і свата потым маглі не выпускаць з дому ў цемру вуліцы, каб не здарылася бяды: каля дома, куды з танцпляцоўкі перамяшчалася «культурнае жыццё», магла сабрацца вялікая кампанія. Ведаеце анекдот? «Калі ноччу выйсці з сельскай дыскатэкі і зірнуць на зорнае неба, з носу перастае цячы кроў».

Дагэтуль бачылі такія ВІА (прафесійныя, вядома) толькі па тэлевізары, а тут вось яны — побач... Мы глядзелі на гэтых хлопцаў, як на жыхароў неба! А калі яшчэ была дзяўчына-салістка...

Вось прыкладна так. Гэтая кампанія спрабавала перахапіць якую-небудзь малечу, каб тая «паклікала» каго трэба. А маглі і ўвогуле любому госцю паставіць ультыматум, схапіўшы за грудкі: вынось! Гэта значыць, што яму прапаноўвалася ўзяць з вясельнага стала бутэльку спіртнога і вынесці яе для ахвотных выпіць на халяву... Трэба сказаць, што пра гэтую «традыцыю» ўсе добра ведалі, здагадваліся, ад каго можна чакаць такога кроку, таму некалькі дарослых імкнуліся трымаць сітуацыю за сталом і па-за ім пад кантролем.

АЛЕ вернемся да больш прыемнага, да музыкі, напрыклад. Некалі ні адно вяселле не абыходзілася без гармоніка. І тосты пад яго распачыналі, і каравай дзялілі напрыканцы, і проста спявалі. Але гэта падыходзіла для больш сталых людзей, моладзь напачатку ладзіла танцы пад кружэлкі на радыёле (цікава, ці ўсе маладыя людзі зараз ведаюць, пра што ідзе гаворка?), праз нейкі час — пад бабінныя магнітафоны, на змену якім прыйшлі ўжо «касетнікі». Вяселлі сваякоў, на якіх даводзілася быць, праводзіліся ў цёплую пару года, таму звычайна скокі ладзіліся на свежым паветры. Маглі і насціл з дошак пакласці, і тэнт які нацягнуць, асвятленне правесці. Таму ні цемра, ні дождж для моладзі перашкодай не былі, танцавалі да ночы. Але сапраўднай «бомбай» была наяўнасць на вяселлі самадзейнай вакальна-інструментальнай групы, якія сталі папулярнымі ў пэўны час. Калонкі, узмацняльнікі, мікрафоны! Электрагітары! Хлопцы самі гралі, самі спявалі. Зрэдку нешта сваё, але часцей перапявалі (як маглі) класіку жанру. Дагэтуль бачылі такія ВІА (прафесійныя, вядома) толькі па тэлевізары, а тут вось яны — побач... Мы глядзелі на гэтых хлопцаў, як на жыхароў неба! А калі яшчэ была дзяўчына-салістка... Спевы такіх вакальна-інструментальных груп разносіліся далёка над пасёлкам, асабліва вечарам і ўначы. Нават не прысутнічаючы на вяселлі, можна было акунуцца ў яго атмасферу, толькі выйшаўшы на двор. Вось гучаць стрыманыя пакуль віншаванні маладым ад бацькоў, першыя «пратакольныя» песні пра вяселле (ды прыгадайце хаця б эпізод з «Белых Росаў», яно так усё і было), але потым «градус» свята відавочна рос і ўжо было чутно, як да мікрафона рвуцца разняволеныя госці... Калі ж гаварыць пра час сённяшні, можна прыгадаць адзін анекдот: «Вяселле было ціхім — у рэстаране быў бясплатны Wi-Fi».

ЯШЧЭ раней не было заведзена спецыяльна запрашаць на вяселле фатографа. Ды і дзе іх было браць? Добра, калі сярод родных ці суседзяў быў які аматар, што мог зрабіць дзясятак чорна-белых цьмяных здымкаў. Гэта цяпер маладыя за паўгода дамаўляюцца: асобна наконт відэа, асобна — наконт фотасесіі. Аўтар гэтых радкоў на пачатку 1990-х гадоў меў падпрацоўку да студэнцкай стыпендыі: здымаў на свой «Зеніт» вяселлі. Нехта абмяжоўваўся толькі картачкамі з роспісам у сельскім Савеце — на фоне герба на сценцы, са сведкамі, з бацькамі, сябрамі. Іншыя прасілі сфатаграфаваць усю дзею: як малады з дружкамі рыхтаваліся, як «выкуплялі» нявесту, як маладая кідае ў натоўп дзяцей і дарослых пасля роспісу цукеркі (па гуках вясельнага картэжу ўсе ведалі, што сёння ў некага вяселле, і затрымліваліся ў цэнтры пасёлка каля Савета, каб высветліць — у каго ж), як маладым «перагароджвалі» дарогу на шляху з ЗАГСа, як бацькі сустракалі іх хлебам-соллю. Потым застолле, танцы, падарункі маладым сужэнцам пад традыцыйны каравай... Я любіў тады жартаваць, што фатограф — трэці чалавек на вяселлі пасля жаніха і сведкі (пакуль не з'явіліся «мыльніцы», трэба было ўмець зводзіць у адно цэлае, як той казаў, вытрымку з дыяфрагмай, а потым друкаваць самому фатаграфіі). І машыну табе дададуць, каб наперадзе картэжу ехаць (паспець падрыхтавацца да эфектнага кадра) і за стол пасадзяць, накормяць-напояць. Менавіта ў тыя часы пачало даволі хутка мяняцца стаўленне да вяселляў і яны самі. Першыя долары ў руках, пакуль яшчэ патрыманыя іншамаркі, апетыя малінавыя пінжакі... Змянялася, найперш, сама краіна...

А маглі і ўвогуле любому госцю паставіць ультыматум, схапіўшы за грудкі: вынось! Гэта значыць, што яму прапаноўвалася ўзяць з вясельнага стала бутэльку спіртнога і вынесці яе для ахвотных выпіць на халяву...

ПРОВАДЫ ў армію па сваёй падрыхтоўцы да іх вельмі нагадвалі перадсвяточныя клопаты (для бацькоў прызыўніка, вядома): тое ж грашовае пытанне, гатаванне страў, патрэбныя сталы-лаўкі. Праўда, і шмат гадоў таму, і зараз яны застаюцца выключна дамашнім мерапрыемствам. Ніколі не чуў, каб провады ладзілі ў кавярні. І ў тым быў і ёсць свой сэнс: адкуль, як не з роднага дому, павінен быў ісці абараняць Радзіму малады чалавек? Адзінае, што запрошаных на вечарыну гасцей было менш, чым на вяселлі, а моладзі было нашмат больш. Сябры дзяцінства, равеснікі з родзічаў, учарашнія аднакласнікі. Дарэчы, у многіх выпадках раней менавіта на провадах адбывалася адна вельмі значная падзея: прадстаўленне ўпершыню бацькам (або іншым прысутным) дзяўчыны прызыўніка. Калі яна, вядома, была. Клятваў уголас пра чаканне ад яе асабліва не чакалі, але, як правіла, дарослыя члены сям'і хлопца відавочна прыглядаліся да пасіі сына і думалі менавіта пра тое самае. А бывала па-рознаму: адны чакалі і потым сапраўды стваралі сям'ю, іншыя разыходзіліся як у моры караблі — або яшчэ падчас службы хлопца, або пазней. Можна сказаць, усё як і зараз... Улічваючы, што некага з хлопцаў прызывалі ў войска ці не адразу пасля заканчэння школы, на провадах часам складвалася ўражанне, што гэта сустрэча выпускнікоў або святкаванне дня народзінаў. Каб не нагода. Пра яе рана ці позна нагадвала сляза маці прызыўніка і трывожна-стрыманае слова на дарогу бацькі. Зараз усе беларускія хлопцы служаць дома, таму такая рэакцыя бацькоў успрымаецца як своеасаблівая традыцыя, маўляў, службы — мы пачакаем.

КАЛІ ў войска ішлі мае стрыечныя браты, нават навіна аб прызыве ў праслаўленыя пагранічныя войскі (што было вельмі ганаровым) успрымалася трывожна — у паветры ўжо некалькі гадоў луналa слова «Афганістан»... І аднаму з іх давялося трапіць і ў «пагранцы», і «за рэчку», балазе, усё абышлося. Хаця нават адзін яго выпадкова пачуты аповед прымушае думаць, што такое не можа абысціся ўвогуле, калі ты бачыў... А хлопец-танкіст з пасёлка вярнуўся дадому ў цынкавай труне — падарваўся на міне. Я бачыў, як з пахавання, равучы рухавіком на пад'ёме, вяртаўся ў ваенную часць БТР, і памятаю, добра ўжо ўсведамляючы, што адбылося, свае дзіцячыя адчуванні... Нават калі абмінаў каго лёс апынуцца на вайне, усё адно — краіна была вялікая, служыць накіроўвалі так далёка, што часцей за ўсё салдаціка не бачылі дома ўсе два гады яго службы. Напрыклад, мой найлепшы школьны сябра патрапіў на Дальні Усход, у Хабараўск. Яшчэ адзін аднакласнік служыў на Байкануры, хлопцу з сухапутнай Беларусі з паралельнага класа давялося несці службу ў марской пяхоце (не памятаю ўжо дзе). А пазней быў развал краіны, і пакуль Беларусь не стала суверэннай дзяржавай, на провадах хлопцаў у армію было трывожна, хаця гэтага імкнуліся і не паказваць. Па-сапраўднаму весяліліся, толькі калі яны вярталіся дадому...

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Хотлянский сельский исполнительный комитет
18 марта 2015 года
по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Хотляны, ул. 4-я, д. 3а, кабинет председателя (1-й этаж) в 12.00

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)
Лот № 1	Хотлянский с/Совет	д. Толкачевичи-1 ул. Центральная, д. 68А	0,1500	625681717601000062	24 000 000
Лот № 2		д. Толкачевичи-1 ул. Центральная, д. 68Б	0,1500	625681717601000063	24 000 000
Лот № 3		п. Чирвоная Нива, ул. Центральная, д. 10	0,2382	625681709101000040	36 000 000

Целевое назначение участков — для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3641062500084 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600110126, код платежа — 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: **Минская область, Узденский район, аг. Хотляны, ул. 4-я, д. 3а с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 12 марта 2015 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина — нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация — с 8.30 до 11.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by**, либо по телефонам **(801718) 38 311, 38 346.**

ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа»

ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ПЕРЕГОВОРОВ

на выполнение ремонтно-восстановительных работ поврежденного участка ВОЛС ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» на участке вдоль улицы Немига в г. Минске.

С проектно-сметной документацией можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Сурганова, 48А, тел. (017) 209 41 00.**
Срок представления предложений – **19 февраля 2015 года до 12.00 часов.**

УНП 101541722

Да ўвагі акцыянераў
Адкрытага акцыянернага таварыства «Сталічны праспект»!

18 сакавіка 2015 года
АДБУДЗЕЦЦА ГАДАВЫ АГУЛЬНЫ СХОД АКЦЫЯНЕРАЎ

ААТ «Сталічны праспект»

(г. Жабінка, вул. Камарова, 6, каб. 3).

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці ААТ «Сталічны праспект» у 2014 годзе і асноўных накірунках дзейнасці Таварыства на 2015 год.

2. Справаздача назіральнай рады ААТ «Сталічны праспект» за 2014 год.

3. Справаздача рэвізійнай камісіі пра вынікі праведзенай рэвізіі за 2014 год і заключэнне па бухгалтарскаму балансу, справаздачы аб прыбытках і стратах, гадавой справаздачы ААТ «Сталічны праспект». Азнаямленне Таварыства з заключэннем аўдытараў.

4. Зацвярджэнне гадавых справаздач, бухгалтарскага балансу і справаздачы аб прыбытках і стратах за 2014 год.

5. Зацвярджэнне размеркавання чыстага прыбытку за 2014 год. Аб выплаце дывідэндаў за 2014 год.

6. Аб накірунках выкарыстання чыстага прыбытку ААТ «Сталічны праспект» на 2015 год.

7. Абранне членаў назіральнай рады і членаў рэвізійнай камісіі ААТ «Сталічны праспект».

8. Аб прызначэнні матэрыяльнай узнагароды членам назіральнай рады і рэвізійнай камісіі.

9. Аб зацвярджэнні змяненняў у Статут Таварыства.

Форма правядзення Сходу – **вочная.**

Месца правядзення Сходу – **г. Жабінка, пасёлак Цукровага завода, клуб ААТ «Жабінкаўскі цукровы завод».**

Пачатак работы сходу: **18 сакавіка 2015 года ў 12 гадзін 45 хвілін.**

Рэгістрацыя асоб, якія маюць права на ўдзел у Сходзе, ажыццяўляецца ў дзень правядзення Сходу па месцы правядзення Сходу на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць асобу, і належна аформленых даверанасцяў. Час пачатку рэгістрацыі: **12 гадзін 30 хвілін.** Час завяршэння рэгістрацыі: **12 гадзін 45 хвілін.**

З матэрыяламі Сходу можна азнаёміцца з **02 сакавіка 2015 года па 17 сакавіка 2015 года** ў працоўныя дні з 9 да 16 гадзін па адрасе: **г. Жабінка, вул. Камарова, 6, каб. 3.**

УНП 290984478

Открытое акционерное общество

«Центроэнергомонтаж»

ПРОВОДИТ 20 марта 2015 года ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2014 году и основных направлениях деятельности Общества в 2015 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год.
3. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества (покрытии убытков), и выплате дивидендов.
5. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2015 год и 1 квартал 2016 года.
6. Об избрании членов совета директоров и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членов совета директоров и ревизионной комиссии.
8. О применении прямого и индексного методов переоценки основных фондов.

Акционеры могут ознакомиться с материалами собрания в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 12 марта 2015 года по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 7 с 8 часов 15 минут до 17 часов, перерыв на обед с 12 часов 30 минут до 13 часов 15 минут.

Место проведения собрания: г. Минск, Велосипедный пер., 7.

Время начала проведения собрания — 11 часов 00 минут.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01 марта 2015 года.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 10 часов до 10 часов 45 минут.

Регистрация участников собрания производится по предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров — по доверенности на передачу права участия и голосования на собрании.

УНП 100092167 *Совет директоров*

Открытое акционерное общество

«Дорожно-строительный трест № 5»

(г. Минск, ул. Широкая, 26)

извещает о проведении 20 марта 2015 года в 11 часов 00 минут ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26 (актовый зал). Форма проведения собрания: очная.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2014 году и основных направлениях развития Общества в 2015 году.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2014 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2014 год.
5. О распределении чистой прибыли, объявлении и выплате дивидендов по результатам деятельности Общества за IV квартал 2014 года.
6. Утверждение направлений распределения и использования чистой прибыли Общества на 2015 год и I квартал 2016 года.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об определении размера вознаграждений и компенсации расходов членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26, отдел механизации и энергетики, по рабочим дням с 11 марта 2015 года по 19 марта 2015 года с 8^{00} до 17^{00}, (понедельник–четверг) и с 8^{00} до 15^{45} (пятница), либо 20 марта 2015 года по месту проведения собрания, тел. для справок (017) 281 24 27.

Регистрация акционеров (их представителей), прибывших на собрание, состоится 20 марта 2015 года с 09^{30} до 10^{45} по месту проведения собрания. При себе иметь паспорт, представителю акционера иметь паспорт и доверенность акционера или договор.

УНП 100219908 *Наблюдательный совет ОАО «ДСТ № 5»*

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703
Продавец	ОАО «Оршаагропроммаш», г. Орша, ул. Ленина, 215.

Предмет аукциона (объекты недвижимости реализуются одним лотом):

Наименование	Общ. площадь	Инвентарный номер	Адрес
Административно-бытовой корпус цеха № 4	1664,6 кв.м	240/С-40711	г. Орша, ул. Селицкого, 2
Назначение – здание административно-хозяйственное; год постройки – 1985; материал стен – ж/б плиты; 3 этажа; составные части и принадлежности: подвал, две галереи, два наружных водопровода			
Наименование	**Общ. площадь**	**Инвентарный номер**	**Адрес**
Здание цеха № 4	4043,2 кв.м	240/С-40713	г. Орша, ул. Селицкого, 2/1
Назначение – здание специализированное иного назначения; год постройки – 1985; материал стен – кирпич, ж/б плита; 1 этаж; составные части и принадлежности: две пристройки, две антресоли, ведомственные производственные автомобильные дороги (пл. 1362 кв.м), наружная канализация, наружный водопровод, кабельная линия.			
Объекты недвижимости расположены на земельном участке **пл. 1,1949 га**, предоставленным продавцу на праве постоянного пользования.			
Начальная цена с НДС – 10 509 207 600 белорусских рублей.			
Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».			
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за предмет аукциона производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.			
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**			
Аукцион состоится **18.03.2015** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703.**			
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.03.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».			

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 12 марта 2015 года повторных торгов по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минский тракторный завод»

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	- «гараж с пристройкой» общей площадью 198,4 кв.м, расположенный по адресу: Гродненская область, Сморгонский район, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 26Б/2 (назначение - здание специализированное автомобильного транспорта, инвентарный номер в ЕГРНИ – 443/С-14055; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража (ЗВ1/к), кирпичная пристройка (Г1/к)); - «КТП (контрольно-технический пункт)» общей площадью 92,8 кв. м, расположенный по адресу: Гродненская область, Сморгонский район, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 26Б (назначение – здание неустановленного назначения, инвентарный номер в ЕГРНИ – 443/С-15258; составные части и принадлежности: мансардное кирпичное оштукатуренное здание контрольно-технического пункта (А2/к), дощатая мансарда ((А2/к)), забор из металлической сетки (а), металлические ворота (б), забор из бетонных плит (в), асфальтобетонное покрытие (г), бетонированные борты (д, ж)); - «гараж-стоянка» общей площадью 506,1 кв. м, расположенный по адресу: Гродненская область, Сморгонский район, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 26Б/1 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, инвентарный номер в ЕГРНИ – 443/С-15259; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гараж-стоянка (2Б1/к))
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер – 425650100001003236, площадь – 0,3897 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений
Продавец имущества	ОАО «МТЗ», ул. Долгобродская, 29, 220070, г. Минск
Организатор торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)	1 007 453 150 белорусских рублей
Сумма задатка	100 000 000 белорусских рублей

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае признания торгов несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику торгов), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель аукциона (единственный участник торгов) в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под подпись.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником торгов) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником торгов) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, по согласованию с продавцом.

Торги проводятся **12 марта 2015 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.02.2015 по 10.03.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)333-49-67 (ОАО «МТЗ»);
(01592)3-06-84 (Филиал ОАО «МТЗ» «Сморгонь-тракторосервис МТЗ»).

20 марта 2015 года в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Татьяна».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год и основные направления деятельности общества в 2015 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2014 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2014 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2015 году и первом квартале 2016 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Татьяна»: г. Гомель, ул. Павлова, 26.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Павлова, 26.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 09.03.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400068248 Наблюдательный совет.

■ Расклад на заўтра

У ГОД МОЛАДЗІ — БЕЗ ФАРМАЛЬНАСЦЯЎ

Адной з асноўных задач сістэмы адукацыі на гэты год першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ назваў павышэнне прэстыжу педагагічнай прафесіі.

— Сучасная школа мае патрэбу ў такіх педагагічных кадрах, якія валодаюць высокім узроўнем прафесійнай культуры, сацыяльнай актыўнасці і мабільнасці. Можна смела казаць, што часта ад сацыяльнай актыўнасці, прынцыповасці і неабыякавасці настаўніка залежаць не толькі поспехі яго вучняў, але і эфектыўнасць узаемадзеяння сям'і і школы, сям'і і соцыуму, — падкрэсліў Вадзім Богуш у сваім выступленні на калегіі, прысвечанай падвядзенню вынікаў за папярэдні год. — Ад узроўню кадравага патэнцыялу залежыць і дынаміка развіцця галіны, таму адной з найважнейшых задач на 2015 год з'яўляецца для нас распрацоўка праграмы «Кадры».

Па словах Вадзіма Богуша, у цэлым сістэма адукацыі нашай краіны не адчувае недахопу ў кадрах. Іх ратацыя звязана пераважна з выхадам педагогаў на заслужаны адпачынак. Праўда, у асобных установах напружанне, хоць і часовае, узнікае. Таксама назіраецца тэндэнцыя павышэння сярэдняга ўзросту прафесарска-выкладчыцкага складу ў ВНУ, асабліва гэта тычыцца выкладчыкаў з навуковымі ступенямі.

Сярэднямесячная заработная плата педагагічных работнікаў (акрамя прафесарска-выкладчыцкага складу) была ў 2014 годзе 4,6 млн рублёў, або 75,4% ад узроўню сярэдняга заробку па краіне. Канкрэтна ў настаўнікаў — 4,8 млн рублёў, або 79,3% ад сярэдняга заробку па краіне, а ў прафесарска-выкладчыцкага складу — 6,9 млн рублёў, або 113%.

«Сапраўдным падарункам краіне стане Маладзёжная сталіца, якая будзе абвешчаная па выніках конкурсу напрыканцы бягучага года».

У 2014 годзе заработная плата педагагічных работнікаў павышалася двойчы. Павелічэнне надбавак за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый педагагічным работнікам з 1 верасня дазволіла павысіць сярэднюю заработную плату настаўнікаў у сярэднім на 18%.

Разам з тым сярод галін сацыяльнай сферы па ўзроўні заработнай платы адукацыя заняла летась перадапошняе месца з паказчыкам 4121,3 тыс. рублёў.

— Сёлета і ў наступныя гады трэба імкнуцца давесці ўзровень сярэдняй зарплаты настаўніка да ўзроўню сярэдняй зарплаты ў рэгіёне, — паставіў задачу Вадзім Богуш. — А заробак прафесарска-выкладчыцкага складу павінен перавышаць узровень сярэдняй зарплаты ў краіне ў 1,5 раза.

ВЫНІКІ АПТЫМІЗАЦЫІ

— Улічваючы, што выдаткі на адукацыю — адна з самых важкіх частак бюджэту, асаблівую ўвагу мы надаём эканамічным аспектам адукацыі, — падкрэсліў Вадзім Богуш. — З улікам дэмаграфічнай сітуацыі, патрэбы ў кадрах і адукацыйных паслугах праводзіцца аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі. Летась была закрыта альбо рэарганізавана 341 установа дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Колькасць устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі скарацілася на 18 адзінак. 8 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі былі ўключаны ў структуру ўстаноў вышэйшай адукацыі.

Мы імкнёмся шырэй выкарыстоўваць велізарны патэнцыял універсітэцкай навукі, гатоўнасць арганізацый і грамадзян укладваць сродкі ў адукацыю. Іншымі словамі, мы вучымся зарабляць грошы для адукацыі. І ў нас гэта паступова пачынае атрымлівацца.

У 2014 годзе колькасць замежных грамадзян, якія навучаюцца ва ўстановах адукацыі нашай краіны, павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 2081 чалавека і склала 18 560 чалавек. Адукацыю ў Беларусі сёння атрымліваюць грамадзяне са 103 краін свету. Але для далейшага нарошчвання экспарту адукацыйных паслуг трэба асвойваць новыя рынкі, працаваць над павышэннем іміджу і прывабнасці беларускай адукацыі ў сусветнай адукацыйнай прасторы.

Станоўчы імпульс гэтым працэсам, як спадзяюцца ў Міністэрстве адукацыі, надасць уключэнне Рэспублікі Беларусь у Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі ў рамках Балонскага працэсу. Заяўка Беларусі на ўключэнне ў Балонскі працэс будзе разглядацца якраз сёлета.

КАДРЫ ТРЭБА ГАДАВАЦЬ

— У 2015 годзе працягнецца наша размова з моладдзю ў фармаце адкрытага дыялогу «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня», — паведаміў першы намеснік міністра адукацыі. — Абвешчаны Год моладзі ўжо стартаваў. Яго яркім пачаткам стаў 42-гі з'езд БРСМ, Рэспубліканскі студэнцкі форум у Горках і фінал конкурсу «Студэнт года». У Горках быў створаны грамадскі студэнцкі савет пры Міністэрстве адукацыі і падтрымана яго ініцыятыва аб рэалізацыі ў сацыяльных сетках праекта «Адукацыя вачамі маладых». Гэта пацвярджае і выбраны напрамак — удзел самой моладзі ў абмеркаванні праблем і прыняцці рашэнняў. Між іншым, у чэрвені ў нацыянальным аздараўленчым цэнтры «Зубраня» пройдзе тэматычная змена «Маладзёжнай ініцыятыве — ТАК!». Сапраўдным падарункам краіне стане Маладзёжная сталіца, якая будзе абвешчаная па выніках конкурсу напрыканцы бягучага года.

— У Год моладзі я хачу папрасіць усе ўстановы адукацыі прадумаць нефармальныя «жывыя» мерапрыемствы, якія насамрэч будуць цікавыя для моладзі, — звярнуўся да прысутных **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

Міністр выказаў незадаволенасць тым, як вядзецца ў краіне работа з кадравым рэзервам.

— Створаная база таленавітай моладзі выкарыстоўваецца слаба. Я цікавіўся, колькі зваротаў было да гэтай базы, хто запытвае інфармацыю, і магу сказаць, што зусім нязначная колькасць арганізацый да яе звяртаецца. Я разумею, што таленавіты чалавек (асабліва, калі ён таленавіты ў нейкай пэўнай вобласці) і таленавіты кіраўнік — гэта не адно і тое ж. Тым не менш дэфіцыт кіраўніцкіх кадраў у нас адчуваецца сёння на ўсіх узроўнях. Гэтае пытанне павінна хваляваць як кіраўнікоў абласцей, так і рэктараў. Кіраўніцкія кадры трэба гадаваць. Мяркую, што партнёрства ў гэтым пытанні з грамадскімі маладзёжнымі арганізацыямі, было б вельмі карысным. Маладзёжныя лідары і ёсць той самы рэзерв для папаўнення кіраўніцкіх пасад, — дадаў Міхаіл Жураўкоў.

Надзея НІКАЛАЕВА

Што яшчэ будзе зроблена ў сістэме адукацыі сёлета:

— увядзенне профільнага навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

— завяршэнне эксперымента па незалежнай атэстацыі вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі і прыняцце рашэння аб мэтазгоднасці рэалізацыі гэтай мадэлі;

— пераход да адносна завершанай II ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

— максімальна поўнае ўключэнне ў адукацыйны працэс мабільных прылад асабістага і калектыўнага карыстання;

— распрацоўка «воблачных» электронных адукацыйных рэсурсаў;

— стварэнне навукова-адукацыйных кластараў, у тым ліку па педагагічнай адукацыі;

— развіццё дыстанцыйнай формы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў;

— фарміраванне новай класіфікацыі спецыяльнасцяў і кваліфікацый прафесійнай адукацыі ў адпаведнасці з відамі эканамічнай дзейнасці і МСКО 2011;

— укараненне і развіццё ў ВНУ модульнага прынцыпу пабудовы адукацыйных праграм, распрацоўка механізмаў і сеткавай формы рэалізацыі адукацыйных праграм магістратуры.

«Ад сацыяльнай актыўнасці, прынцыповасці і неабыякавасці настаўніка залежаць не толькі поспехі яго вучняў, але і эфектыўнасць узаемадзеяння сям'і і школы, сям'і і соцыуму».

Фота Анатоля КЛЁШЧУКА.

■ На слыху

ЗА МЯЖОЙ ПАРАЗУМЕННЯ

Гісторыя з 84-гадовай бабулькай, якую апякунка быццам бы выжыла з магілёўскай аднапакаёўкі, нарабіла шмат шуму. Суд Ленінскага раёна горада Магілёва скасаваў дагавор пажыццёвага ўтрымання (рэнты), падпісаны паміж пенсіянеркай і маладой жанчынай. Былая папячыцельніца разам са сваёй сям'ёй з'ехала з кватэры. Здавалася б, можна паставіць кропку. Але…

Бабульку сапраўды шкада. Хата, у якой яе знайшлі супрацоўнікі бялыніцкага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання, насамрэч знаходзілася ў антысанітарным становішчы. Іншая справа, што старая жыла там месяцамі і раней. Але ж гэта істотна справы не мяняе. Па дому сапраўды «плакаў» рамонт. А дзве казы, якія былі ў гаспадарцы, парадку не дабаўлялі. Адным словам тое, што ўбачылі сацработнікі, моцна іх уразіла.

— А калі мы даведаліся, што ў бабулінай магілёўскай кватэры жыве чалавек, які павінен яе даглядаць, абурыліся да глыбіні душы, — не стрымлівае эмоцый **дырэктар бялыніцкага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Алена КРУПЕНЬКІНА.** — Патэлефанавалі той жанчыне і патрабавалі, каб яна вызваліла чужую жылплошчу. Тая не адмаўлялася, але і не спяшалася. І тады мы звярнуліся ў пракуратуру. У выніку адбыўся суд, які і расставіў усе кропкі над «і».

— Дык сапраўды гэтая апякунка была такая дрэнная? — з крыўдай за няшчасную бабульку цікаўлюся я.

— Цяжка сказаць, — сумняваецца дырэктар цэнтра. — Бабуля крыху дзіўнаватая, самі разумееце, узрост. Магчыма, яна і збягала з горада. Калі суд скасаваў той дагавор, бабку да сябе забраў пляменнік. Потым завёз яе ў тую магілёўскую кватэру і там пакінуў. А праз 2 дні старую бачылі ўжо ў Бялынічах на прыпынку, без верхняга адзення.

Алена Крупенькіна не хавала і тое, што бабулька часам загаворваецца, ірвецца ў вясковую хату. Маўляў, там маці старая і сястра, якім трэба дапамагаць па гаспадарцы. Але не толькі маці, але нават і сястры ўжо даўно няма ў жывых.

Цяпер старая жанчына ў бальніцы, вырашаецца пытанне па змяшчэнні яе ў інтэрнат. Там, ва ўсялякім разе, яна будзе пад пастаянным наглядам.

У Таццяны ж, якая да нядаўняга часу апякала старую, свой погляд на падзеі.

— Нас у гэтай гісторыі выставілі сапраўднымі злачынцамі, але ніхто не кідаў бабульку, — кажа яна. — Наведвалі некалькі разоў на месяц, прывозілі ў Магілёў, мылі, але яна ўсё роўна збягала ў вёску. Мы нават тэлефонную сувязь туды правялі, каб заўсёды быць у курсе яе спраў. Я яе ведаю яшчэ з канца 90-х, яна прыязджала ў нашу вёску Бахані на могілкі да блізкіх. Нават сцвярджала, што мы з ёй нейкая далёкая радня. Расказала, што ў яе ёсць кватэра ў Магілёве, але ёй больш падабаецца жыць у родным Цяхціне. Там прырода, жывёлу можна трымаць. Потым мы амаль 10 гадоў ніякіх стасункаў не мелі, пакуль яна сама мяне не знайшла. Скардзілася, што ёй цяжка весці гаспадарку, што яна нікому не патрэбная. Мне яе шкада было, і час ад часу наведвала яе ў вёсцы. А некалькі гадоў таму яна мне прапанавала заключыць дагавор праз натарыяльную кантору. Маўляў, я ўсё роўна ў вёсцы, а ты з сям'ёй можаш пажыць у маёй кватэры. Будзеш і за хатай даглядаць, і да мяне наведвацца.

Маладая жанчына кажа, што так і рабіла, але былі цяжкасці, паколькі хутка нарадзіліся двое дзяцей. Прасцей было б бабульку забраць, але ж, як сцвярджае суразмоўца, не магла яна абыходзіцца без вёскі, без сваіх коз ды сабак. А летась, калі здароўе зусім здало, стала сама казаць, што, напэўна, хутка пераедзе ў горад. Таццяна прызнаецца, што яны з мужам ужо падшуквалі варыянты, каб пераехаць з кватэры. Упяцёх, ды яшчэ са старым чалавекам, не вельмі зручна жыць у аднапакаёўцы. Тым больш што на працы абяцалі даць маласямейку. Пераезд у выніку адбыўся, але гэта не выратавала ад непрыемнай гісторыі.

Таццяна згодна з тым, што бабульцы, магчыма, не хапала ўвагі, але ж дзе былі раней сацыяльныя работнікі? Маўляў, бабулька даўно так жыла, а яны забілі трывогу толькі цяпер. Гэтае пытанне я задала начальніку старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Аляксандру Крыкунову.

— Жанчына была прапісана ў Магілёве, таму і высветлілася ўсё нечакана, — патлумачыў ён. — Такіх дачнікаў сярод сталых людзей хапае, але ж кантраляваць іх мы можам толькі па месцы прапіскі. Немагчыма кагосьці прымусіць знаходзіцца ўвесь час дома, гэта будзе абмежаваннем канстытуцыйнага права чалавека. Няхай ён і стары, але пакуль не прызнаны недзеяздольным, сам павінен прымаць рашэнні. А вось тое, што суд скасаваў дагавор, які быў заключаны паміж пенсіянеркай і маладой жанчынай, сведчыць, што парушэнні правоў старой жанчыны ўсё ж мелі месца. Калі бярэш такую адказнасць за лёс іншага чалавека, трэба выконваць свае абавязкі да канца. Нездарма наша служба раіць праз упраўленне юстыцыі, каб натарыусы тлумачылі ўсе наступствы такіх пагадненняў.

Нэлі ЗІГУЛЯ

ДЗВЕ ЛЮБОВІ,
або Чароўная сіла таленту

Цікавыя, нават дзівосныя людзі жывуць між намі! Узяць хоць бы Славіка… Ён, мой сябар з маленства, а цяпер яшчэ і двойчы кум, вясной 1968-га ўсё лавіў сваім новенькім ВЭФам якую-небудзь добрую музыку (замест песень пра партыю ды камсамол), і яму, здаралася, часам шчасціла: слухаў песні Высоцкага альбо нават «Бітлоў». Больш за тое, аднойчы, зусім выпадкова ён «злавіў»… голас — моцны, пранікнёны — які адразу ж запаў у душу… Як мяне, дык гэта дужа здзівіла, бо песня была на замежнай мове, слоў яе сябрук не зразумеў, імя спявачкі не прагучала таксама. Але ж з таго дня Славік задаўся мэтай даведацца пра яе ўсё, што толькі магчыма.

Інтэрнэту тады, вядома ж, не было, але дзякуючы польскаму радыё месяцаў праз колькі ён ужо ведаў (і мне сказаў), што спявачку завуць Мірэй Мацье, што яна нам амаль равесніца, што паходзіць з вельмі беднай шматдзетнай сям'і…

Карацей, сябар стаў фанатам гэтай французжанкі яшчэ тады, калі і слова такога ніхто не чуў, тады, калі саму Мірэй ні на старонках газет ды часопісаў, ні па тэлевізары ніхто ў вочы не бачыў. А калі давялося, Славік разгубіўся, бо ўяўляў гэту спявачку не сказаць, каб жанчынай мажнай, але ў многім падобнай да Людмілы Зыкінай. На экране ж тэлевізара была невысокая, худзенькая дзяўчынка з проста незабыўнымі вачамі на прыгожым твары… Пры гэтым, што ўразіла майго сябра яшчэ больш, голас яе — можна сказаць, падлетка — не патанаў, не губляўся ў хоры ансамбля імя Аляксандрава!..

Славік «фанацеў».

На шчасце, гэта пачуццё («зоркі, як вядома, ніколі не пакідаюць сваіх арбіт») не перашкаджала яму заляцацца да іншых дзяўчат і ў 26 гадоў такі ажаніцца.

На пачатку сумеснага жыцця яна, Ірына, трохі раўнавала мужа да недасяжнай французжанкі. Ды і як было не раўнаваць, калі вечарам ён рассыпаўся салаўём — прызнаваўся ў каханні ёй, а раніцай — можна сказаць, з языка не спускаў зусім іншую…

Усё стала на месца ў іх першую навагоднюю ноч. Славік тады амаль не піў, разам з жонкай цярпліва глядзеў на нецікавых яму гасцей «Блакітнага агеньчыка» і ажывіўся толькі пад раніцу, калі тэлевізар стаў паказваць «Мелодыі і рытмы зарубежнай эстрады». Мірэй спявала «Даруйце мне гэты дзіцячы капрыз», мелодыю якой Іра чула перад пачаткам «Кінапанарамы»…

Мусіць, у чаканні яшчэ адной песні Славік (яна — за кампанію) прасядзеў ля тэлевізара, пакуль ён зусім не згас, а потым з нейкім незвычайным бляскам у вачах сказаў ёй, каб ішла спаць (маўляў, стамілася ж…), а сам (чаго не рабіў ніколі) стаў прыбіраць са стала і нават мыць посуд!

Такім чынам жонка знайшла слабіну ў характары мужа, які толькі да вяселля выглядаў трохі стомленым рамантыкам, а пасля яго аказаўся зусім звычайным чалавекам, вельмі спакойным і стрыманым у сваіх пачуццях, вельмі скупым на праяву эмоцый… Але ж пры гэтым — нечым узрушаны — ён кожны раз выцягваў з шафы прайгравальнік, ставіў на яго любую з чатырох пласцінак любімай спявачкі, зажмурваўся і слухаў.

У такія хвіліны яго лепш было не чапаць, затое потым ён рабіўся такім лагодным і рахманым, ну хоць ты вяроўкі ві!

Іра «віла». Калі трэба было загладзіць нейкую правіну альбо «натхніць» мужа на выкананне чарговага капрызу, выцягвала прайгравальнік сама…

З гадамі мужава захапленне Мірэй яна стала лічыць нейкім дзівацтвам, нейкім пункцікам, які, вядома ж, надаваў яму трохі шарму, але на які — без патрэбы — можна было не звяртаць ніякай увагі.

Так без прыгод і ўзрушэнняў ішлі гады, нават дзесяцігоддзі іх сумеснага жыцця. Нарадзіліся і выраслі дзеці, пайшлі ўнукі… У турботах ды клопатах сужэнцы, дзякаваць Богу, дажылі да пенсіі і ніякіх перамен у сваім жыцці не чакалі…

Усё змянілася ў той вечар, калі Славік пачуў па тэлевізары, што ў Мінск прыязджае Мірэй Мацье, у Палацы Рэспублікі адбудзецца канцэрт.

Ён тады доўга курыў. І засумаваў. Яго ахапіла туга, настальгія па зніклай маладосці. Успомнілася, як падчас службы ў Германіі, 40 гадоў таму, неадступна марыў трапіць у Парыж з поўнымі кішэнямі франкаў, каб з букетам самых прыгожых кветак схадзіць у залу «Алімпія» на канцэрт любімай спявачкі, каб пасля яго купіць усе, якія толькі ёсць, яе запісы… І толькі потым ужо падняцца на Эйфелеву вежу, каб зверху паглядзець на культурную сталіцу свету.

Нязбытныя мары! Бо ў тыя, ужо далёкія часы, простаму савецкаму хлопцу лягчэй было паляцець у космас, чым паехаць у сталіцу Францыі.

…Паколькі канцэрт у Мінску чакаўся 10 сакавіка, Славіку трэба было шукаць грошы не толькі на падарунак да 8-га, але яшчэ і на білеты, бо пазычаць ён ніколі не любіў, нават у мяне. Дзякаваць Богу, мы з ім нядрэнна разбіраліся ў розных аўтамабілях: і калі раней дапамагалі рамантаваць іх за звычайнае «дзякуй» ці сціплы пачастунак, то цяпер за консультацыю, а тым больш за асабісты ўдзел Славік стаў браць грошы — калі 50 тысяч, а калі і 300. Факт, што тыдні праз два ён ужо меў паўтара мільёна рублёў, якіх хапала на квіткі. Праўда, на балкон…

Ён мог пашабашыць яшчэ і зарабіць на партэр, але баяўся, што білетаў не хопіць.

Купіўшы ж (два — для сабе і жонкі), ён схаваў іх пад столлю ў гаражы і часова супакоіўся.

Жонка тым часам была ў пакутлівых развагах. З аднаго боку, звадзіць чалавека на гэты канцэрт азначала дагадзіць яму да скону веку. А з другога — мякка кажучы — дарагое задавальненне… Да таго ж пасля сыходу на заслужаны адпачынак муж неяк ні разу не даставаў той стары прайгравальнік, ні разу не ставіў свае самыя каштоўныя — яшчэ і па грошах, бо купляў іх некалі з рук, з вялікай пераплатай — пласцінкі.

Рашэнне было прынята кампраміснае: захоча схадзіць — скажа, сама прапаноўваць не буду.

Між тым рэкламу канцэрта па тэлебачанні «круцілі» ці не штодня цягам тыдняў і нават месяцаў. Славік зацята маўчаў. Нешта незразумелае пачалося толькі пазней, у лютым, калі ён дастаў з шафы і прыдзірліва агледзеў свой найлепшы касцюм, сам (чаго ніколі не было!) занёс у хімчыстку амаль чыстую куртку, да люстранога бляску начысціў туфлі…

Свята 8 Сакавіка яны адзначылі па нязменнай, як словы ў малітве «Ойча наш», завядзёнцы. Славік купіў сваёй палавіне тры яе любімыя белыя гваздзікі, каробку шакаладных цукерак і бутэльку белага віна, сабе — пляшку гарэлкі. Некалі раней у гэты дзень з падарункамі прыязджалі дзеці, але цяпер сыны віншавалі сваіх жонак, дочкі таго ж чакалі ад мужоў… Маці заставалася хіба што цэлы ранак прымаць іх віншаванні па тэлефоне.

Сёлета гэты звыклы рытуал дапоўніўся толькі адной дэталлю: пасля першага тоста і дзяжурнага пацалунка Славік урачыста падаў ёй канверт і сказаў: «Маці! Паслязаўтра мы слухаем Мірэй!». Гэта азначала, што мара жыцця, мякка кажучы, дарослага чалавека ўсё ж здзяйснялася: вечарам, 10 сакавіка.

…На наступны дзень я завітаў да іх, каб папытацца: «Ну як?» І адразу ж адчуў, што ў хаце нешта змянілася. Не мог даўмецца — што, пакуль не дапяў, што змяніліся самі… гаспадары. У іх позірках адно на аднаго было столькі замілавання, столькі пяшчоты, быццам пажаніліся яны не пазней чым учора.

Пра канцэрт жа Славік расказваць не мог. Паспрабаваў быў — сказаў з чаго ён пачаўся, а потым махнуў рукой: маўляў, няма ў яго ні здольнасцяў, ні патрэбных слоў, каб апісаць уражанне ад Мірэй, ад голасу яе… Жывога…

І куму я лёгка паверыў, бо яшчэ ў маладосці на мае пытанні наконт яго пачуццяў да спявачкі ён казаў, што не мае ім рацыянальнага тлумачэння. Але ж, калі ўявіць, што ў яго (у Славіка) ёсць душа і ў гэтай душы ёсць струны, то яны настроены ва ўнісон толькі з гэтым голасам… Што калі ён чуе яе па радыё ці з пласцінкі, то заплюшчвае вочы і бачыць найчасцей саму Мірэй, ці, у залежнасці ад настрою, як смяюцца шчаслівыя закаханыя дзяўчаты, ці як галосяць матулі, страціўшыя сваіх дзяцей… Што калі ён бачыць яе па тэлевізары, то стараецца нават не міргаць, бо там — вельмі прыгожая жанчына, а калі да прыгажосці дадаць незямнога паходжання голас, то ён тады чуе Жанчыну Вялікую …

Каб паслухаў і я, Славік дастаў прайгравальнік, прынёс свае пласцінкі і даў мне паслухаць (жонка тупала на кухні) больш за палову песень, якія яны чулі ўчора. І ў тым жа парадку.

Павінен прызнацца, што мне, чалавеку бясконца далёкаму ад якіх-небудзь музычных прыхільнасцяў, такі імправізаваны канцэрт вельмі спадабаўся. Да таго ж Іра, калі Славік пайшоў пакурыць, па сакрэце сказала мне, што на канцэрце ён двойчы плакаў: калі гучалі песні «Дзева Марыя мора» і «Бывай, Акропаль». Што пасля канцэрта трохі шкадаваў, што не прагучалі мелодыя з фільма «Гісторыя кахання», «Чао, бамбіна» і тэма з 40-й сімфоніі Моцарта (ёсць, як высвятляецца, і такі твор у гэтай спявачкі!). Што слухачы паднеслі артыстцы, можа, сотні з дзве букетаў і што раздала яна сотні тры аўтографаў.

